Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 МАЯ 2012 г. СЕРАДА № 96 (27211) Кошт 1100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Што робіцца для таго, каб было менш чэргаў грузавых і легкавых аўтамабіляў на мяжы з Польшчай і Літвой? Наколькі рэальна ў межах Мытнага саюза ўкараніць электроннае дэклараванне?**

СТАР 2



**Калі павінны быць выплачаны адпускныя, як разлічваецца памер адпускных і што рабіць, калі наймальнік не выплачвае іх своечасова?**

СТАР 3



**Калі арганізм працяглы час падвяргаецца стрэсу, ён пачынае падаваць фізічныя, разумовыя, эмацыйныя сігналы, якія ўказваюць на тое, што далейшае ўздзеянне стрэсу можа прывесці да праблем.**

СТАР 4

## БЕЛАРУСЬ ЗАЦІКАЎЛЕНА Ў АКТЫЎНЫМ УЗАЕМАДЗЕЯННІ З СЕРБІЯЙ ВА ЎСІХ СФЕРАХ ДВУХБАКОВЫХ АДНОСІН

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Таміслава Нікаліча з перамогай на выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Сербія.**

«Перакананы, што заснаванае на трывалым фундаменце духоўных і культурных сувязяў паміж нашымі народамі беларуска-сербскае супрацоўніцтва мае істотны патэнцыял для далейшага плённага развіцця», — гаворыцца ў віншаванні.

Аляксандр Лукашэнка таксама пацвердзіў зацікаўленасць Беларусі ў актыўным узаемадзеянні з Сербіяй ва ўсіх сферах двухбаковых адносін.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НАКІРАВАЎ СПАЧУВАННІ ПРЭЗІДЭНТУ ЕМЕНА

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванні Прэзідэнту Еменскай Рэспублікі Абдрабо Мансуру Хадзі ў сувязі са шматлікімі чалавечымі ахвярамі ў выніку тэракта ў сталіцы гэтай краіны Сане.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## БЕЛАРУСЬ І КІТАЙ МАЮЦЬ РЭЗЕРВЫ ДЛЯ ПАШЫРЭННЯ ГАНДЛЁВА-ЭКАНАМІЧНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Аб гэтым заявіў учора прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч на сустрэчы з намеснікам старшыні Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Лу Юнсянам, перадае БЕЛТА.**

Кіраўнік урада адзначыў, што Кітай і Беларусь як стратэгічныя партнёры будуюць супрацоўніцтва мудра, з павагай адзін да аднаго і на доўгую перспектыву. Краіны паспяхова развіваюць тавараабарот. «Гадавы абарот $3,5 млрд — гэта добры паказчык. Радуе пазітыўная дынаміка ў тавараабароце як па фізічных і вартасных характарыстыках, так і па наменклатуры тавараў», — сказаў прэм'ер-міністр.

Разам з тым, на яго думку, у Беларусі, як і Кітая, вялікі патэнцыял для пашырэння ўзаемавыгаднага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. «Лічым, што рэзервы далёка не вычарпаны, яны велізарныя, і ўрад бачыць вялікія перспектывы ў гэтай галіне, у першую чаргу, за кошт кааперацыі і канцэнтрацыі на прыярытэтных напрамках. Выдатна, што нашы пункты гледжання супадаюць. У гэтым залог поспеху», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч.

Гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва Беларусі і Кітая дапаўняецца і інвестыцыйным. «Усяго праектаў на $16 млрд. Гэта добры аб'ём», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. Ён адзначыў высокі ўзровень работы па развіцці сумесных праектаў з боку кітайскіх міністэрстваў, ведамстваў і банкаў. Актыўна развіваецца і навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва. «Урад Кітая падтрымаў стварэнне беларуска-кітайскага індустрыяльнага парку. Гэта будзе магутны накіраваны ў будучыню інавацыйны праект», — нагадаў ён. Ва ўрадзе Беларусі ўжо абмяркоўваюць прапановы вядучых сусветных кампаній, якія гатовы ўдзельнічаць у гэтым праекце. Гэта павінна быць высокатэхналагічная і навукаёмістая прадукцыя, экалагічна чыстая і высокапрадукцыйная вытворчасць. Гэта будзе візітная картка гэтай прамзоны», — дадаў ён. Цяпер беларускі бок прапрацоўвае пытанне падрыхтоўкі спецыялістаў, неабходных для праекта.

# ЖЭСам прыйдзецца пацясніцца

**У хуткім часе ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі нас чакае шэраг новаўвядзенняў. Асноўныя з іх тычацца абслугоўвання жылога фонду і коштаў на камунальныя паслугі.**

## АРГАНІЗАЦЫІ ПА АБСЛУГОЎВАННІ ЖЫЛФОНДУ БУДУЦЬ ВЫБІРАЦЦА НА КОНКУРСНАЙ АСНОВЕ

Пра гэта заявіў падчас анлайн-канферэнцыі «ЖКГ: паслугі, тарыфы, якасць», якая праводзілася БЕЛТА, **намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Анатоль ШАГУН**.

Як вядома, канцэпцыя развіцця ЖКГ Беларусі прадугледжвае да 2015 года перавесці абслугоўванне жылфонду на канкурэнтную аснову. Асноўных крытэрыяў, па якіх будуць выбірацца арганізацыі для абслугоўвання жыллёвага фонду, як лічыць Анатоль Шагун, два — гэта кошт абслугоўвання жылфонду пэўнага аб'ёму і якасць паслуг.

Плануецца, што мясцовыя органы ўлады, якія адказваюць за жыллёвы фонд, будуць праводзіць конкурс, узяць удзел у якім змогуць арганізацыі рознай формы ўласнасці, прычым як беларускія, так і замежныя кампаніі. У якасці ўмоў конкурсу, магчыма, будзе разглядацца такі момант, як заключэнне дагавора.

СТАР 3

# БАРКАЛАБАЎСКІЯ ВЕРШНІКІ

**Першы конны паход Магілёў — Баркалабава прайшоў гэтымі днямі. 70-кіламетровы шлях турысты пераадолелі за 15 гадзін — гэта чысты час перамяшчэння вершнікаў, не ўлічваючы прыпынкаў для экскурсій, аглядаў выдатных мясцін і адпачынку. У конным паходзе ўзялі ўдзел 11 чалавек. Ініцыятарамі паходу стала грамадская рада па развіцці аграэкатурызму ў Магілёўскай вобласці пры ўпраўленні фізічнай культуры, спорту і турызму аблвыканкама сумесна з абласным цэнтрам алімпійскага рэзерву па конным спорце і сучасным пяцібор'і і аграсядзіба «Гасціны двор».**





Фота БЕЛТА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір АДАМУШКА, дырэктар дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь:**

***Доступ да архіўных матэрыялаў свабодны для любога грамадзяніна краіны, за выключэннем дакументаў, якія маюць таямніцу асабістага жыцця. Зараз засакрэчаных дакументаў у архівах нямнога. Напрыклад, на 93% рассакрэчаны матэрыялы партыйных архіваў часоў СССР, вядзецца праца і па рассакрэчванні астатніх.***

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 26° |
| Віцебск | + 21° |
| Гомель | + 27° |
| Гродна | + 23° |
| Магілёў | + 22° |
| Мінск | + 22° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.05.2012 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 8140,00 ▼ |
| Еўра | 10420,00 ▼ |
| Рас. руб. | 262,00 ▼ |
| Укр. грыўня | 1010,36 ▼ |

■ Дэпутат і выбаршчык: твар да твару

# Выбарчая акруга Алега Ката

**Муж мяне падколваў: «Пасяджэння сесіі на гэтым тыдні няма, а ты зноў пра парламент будзеш пісаць?» Больш за тое, я сабралася ў камандзіроўку. Бо менавіта таму, што пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў у бліжэйшыя дні не запланавана, дэпутаты адправіліся ў свае акругі, я напрасілася ў адну з іх — Дзяржынскую выбарчую акругу №65. Ашаломленаму мужу так і сказала: «Еду да Ката!» Да Алега Іванавіча Ката, дэпутата Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы.**

**Па-першае — блізка ад Мінска, па-другое, з Алегам Катом у «Звязды» існавала старая дамова пра эксклюзіўнае інтэрв'ю. Ды і ў прэс-цэнтры Дома ўрада шматзначна дадалі: «Ён жа былы ваенкам!» Што стаіць за гэтымі словамі, мне стала зразумела праз некалькі гадзін сумеснай працы з Алегам Іванавічам.**



### УЛАСНЫ ДОМ

Невялікі сціплы кабінет у выканкаме: шыльда з прозвішчам дэпутата на дзвярах, бюст Леніна і «Капітал» Карла Маркса на кніжнай паліцы. Алег Іванавіч глядзіць на насценны гадзіннік і расказвае мне пра чалавека, які павінен прыйсці праз 5 хвілін:

— Грыб Сяргей Казіміравіч, двое дзяцей, маладая сям'я. У 2007 годзе, у ліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, атрымаў участак для будаўніцтва індывідуальнага жылога дома і адкрыў ільготную крэдытную лінію ў памеры 66 мільёнаў рублёў. Выкарыстаў 40 мільёнаў. Астатнія сродкі, укладзеныя ім у будаўніцтва, уласныя. Дом пабудаваў на 70% і збіраўся вясной засяляцца. Аднак 28 студзеня а 4 гадзіне раніцы адбыўся пажар (будаўнікі са Століншчыны няякасна зрабілі дымаход). Згарэў дах, перакрыцці другога паверха, моцна пашкоджаны першы паверх. Сям'я аказалася ў безвыходным становішчы: грошай на аднаўленне дома няма, жывуць на арандаванай кватэры. На льготны крэдыт, хоць бы на тую суму, якая ім была выдзелена і якую яны не забралі, яны ўжо не маюць права...

Гэты выпадак стаў нагодай для звароту дэпутата Алега Ката да кіраўніка Нацыянальнага банка. Сёння, згодна з заканадаўствам, крэдытная лінія на будаўніцтва індывідуальнага жылога дома і кватэры ў панэльным доме адкрываецца на аднолькавы тэрмін — 3 гады. Аднак параўнаць тэрміны будаўніцтва першага і другога нельга. Для жыллёвага кааператыва такі тэрмін можа быць дастатковы, але самастойна пабудаваць дом за два-тры сезоны наўрад ці рэальна. Трэба хоць бы чатыры-пяць гадоў, лічыць дэпутат. Асабліва калі чалавек разлічвае пераважна на сябе.

Сяргей Грыб збіраўся засяліцца на пяты год. Пры тым, што ўсе гады ён, лічы, жыў на будоўлі. Практычна ўсё рабіў сваімі рукамі.

Ён ні на хвіліну не спазніўся. Хударлявы, ветлівы, спакойны. Па яго рэакцыі на словы Алега Іванавіча было відаць, што гэты чалавек на многае не спадзяецца. Ён не прывык прасіць... Пагаджаючыся ківаў, калі Алег Кот тлумачыў пра немагчымасць скарыстацца льготным крэдытам, пра нерэальнасць дабіцца хуткіх змен у заканадаўстве, — толькі позірк мужчыны зрабіўся застылым.

Аднак пры наступных словах нешта ў твары бацькі сямейства змянілася. Ён яшчэ не паверыў, але надзея, нібы агеньчык, асвяціла яго рысы.

— Сёння я абмеркаваў пытанне з Мінскім лясгасам пра дапамогу табе як пагарэльцу, — хутка дадаў Алег Кот.

СТАР 3

## БЕЛАРУСЫ СТАЛІ БОЛЬШ АКТЫЎНА ЕЗДЗІЦЬ ЗА МЯЖУ

**Аб гэтым расказаў начальнік галоўнага консульскага ўпраўлення МЗС Беларусі Аляксандр Астроўскі, перадае БЕЛТА.**

«Беларусы сталі значна больш актыўна ездзіць за мяжу на працягу апошніх 3-5 гадоў. Часам нашы грамадзяне аказваюцца ў экзатычных краінах свету і з дзіўнымі мэтамі», — адзначыў ён. У 2011 годзе расійскі бок дапамог беларусам, якія трапілі ў цяжкую сітуацыю ў Грэцыі, Іспаніі, Нікарагуа, Перу, Партугаліі, Чылі, Кіпры, некаторых дзяржавах Паўднёва-Усходняй Азіі. Найбольш частыя праблемы, з якімі за мяжой сутыкаюцца беларусы — страта або крадзеж дакументаў, грошай, білетаў, парушэнне міграцыйнага заканадаўства, учыненне ДТЗ, адсутнасць страхавога поліса. У мінулым годзе беларускія замежныя ўстановы афармілі амаль 5 тыс. пасведчанняў на вяртанне ў Беларусь узамен згубленых пашпартоў.

## МЕТАНОН ІШОЎ ПА ПОШЦЕ

**Тры жыхары Гомеля абвінавачваюцца ў незаконным абарачэнні наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў.**



Маладыя людзі арганізавалі канал кантрабанднай пастаўкі псіхатропнага рэчыва праз міжнародную паштовую сувязь. Наркотыкі перасылалі ў міжнародных паштовых адпраўленнях. Спажыўцы плацілі за «тавар» пры дапамозе міжнародных электронных плацяжоў («вэб-мані»). Арганізатары кантрабанднага канала былі затрыманы супрацоўнікамі КДБ у момант атрымання чарговай пасылкі з Паўднёва-Усходняй Азіі. У паштовым адпраўленні знаходзілася больш за 100 грамаў парашку белага колеру. Паводле заключэння экспертызы, рэчыва з'яўляецца метанонам. Метанон (JWH-018) — сінтэтычны канабіноід, уздзеянне якога ў пяць разоў мацней, чым эфект ад ужывання канопляў. Ён з'яўляецца кампанентам папулярнай у пэўных колах сумесі Spice.

Затрыманыя — жыхары Гомеля ўзростам ад 27 да 35 гадоў. Самы малады ўжо адбываў пакаранне за аналагічнае злачынства. Зараз упраўленнем КДБ па Гомельскай вобласці праводзяцца следчыя дзеянні. Правяраецца версія аб выкарыстанні кантрабанднага канала для далейшай перапраўкі наркатычных і псіхатропных рэчываў у краіны Еўрасаюза.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ, Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### АЎТОБУС СА СТУДЭНТАМІ ЗВАЛІЎСЯ Ў ПРОРВУ

У Албаніі аўтобус з 50 студэнтамі зваліўся з абрыву, у выніку чаго 12 чалавек загінулі і больш за 20 атрымалі раненні, паведамляюць інфармагенцтвы. Сярод загінулых 11 дзяўчат і кіроўца. Аўтобус ехаў з албанскага горада Эльбасан у курортны горад Саранда і ўпаў у бездань са стаметровай вышыні ў раёне горада Хімара, за 220 кіламетраў ад сталіцы Тыраны. Прычыны аўтакатастрофы высвятляюцца. Улады Албаніі абвясцілі 22 мая днём агульнанацыянальнай жалобы па 12 ахвярах трагедыі.

### АЎСТРАЛІЯ — «САМАЯ ШЧАСЛІВАЯ КРАІНА»

Весялей за ўсё на планеце жывецца грамадзянам Аўстраліі, высветлілі аналітыкі Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця. Рэйтынг краін з найлепшым жыццём (Better Life Index) паказаў: аўстралійцам жывецца выдатна, піша The Wall Street Journal. Па-першае, Аўстралію ў меншай ступені закрануў сусветны фінансавы крызіс, так што насельніцтва не пакутуе ад беспрацоўя (у красавіку яно была зафіксавана на ўзроўні 4,9%, пры тым, што еўрапейскі паказчык — 10,9%, а ў ЗША беспрацоўе было 8,1%). Да таго ж цяпер краіна перажывае эканамічны бум, які падаграваецца попытам на жалезную руду і вугаль, якімі так багатая Аўстралія. Ды і наогул, якасць жыцця на Пятым кантыненце — многім на зайздрасць. Так, 85% аўстралійцаў, якія прынялі ўдзел у даследаванні, адзначылі, што ацэньваюць стан свайго здароўя на «выдатна». А яшчэ ў аўстралійцаў ёсць магчымасць цікава праводзіць вольны час і дастаткова быць з сям'ёй — сярэдні аўстралійскі мужчына па тры гадзіны за суткі прысвячае дзецям і хатнім клопатам.

### ЖОНКІ ФУТБАЛІСТАЎ РАЗДЗЕЛІСЯ ДЗЕЛЯ ПЕРАМОГІ НА ЕЎРА-2012



Жонкі гульцоў зборнай Украіны Яўгена Селязнёва, Яўгенія Канаплянкі і Алега Гусева напярэдадні чэмпіянату Еўропы па футболе паўсталі ў вельмі адкрытым вобразе на старонках мужчынскага часопіса. Дзеля перамогі зборнай Украіны на хатнім Еўра-2012, дамы знялі з сябе адзенне і звярнуліся да сваіх каханых з заклікам: «Без медалёў не вяртайцеся!».

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ЛІТОЎСКІ ПРЭМ'ЕР: МАСКВА РАСКАЕЦЦА І ВЫПЛАЦІЦЬ КАМПЕНСАЦЫЮ

**Прэм'ер-міністр Літвы Андрус Кубілюс выказаў надзею, што Расія калі-небудзь прызнае факт акупацыі гэтай краіны ў перыяд яе ўваходжання ў склад СССР.**




«Мы лічым, што ў Расіі, дзе праходзяць розныя працэсы і розныя дыскусіі, можна назіраць за тым, як праз 20 гадоў пасля 1990 года краіна набліжаецца да таго моманту, калі яна зможа больш адкрыта зірнуць на сваю гісторыю і на гісторыю ўсяго Савецкага Саюза, на тую шкоду, якую таталітарны рэжым СССР прычыніў такім краінам, як Літва», — заявіў палітык у эфіры Літоўскага радыё ў аўторак.

Варта адзначыць, што гэта заява была зроблена на фоне плана па стварэнні ўрадавай камісіі па падрыхтоўцы перагаворных установак і плана дзеянняў па кампенсацыі ўрону, нанесенага Літве ў 1940-1991 гадах Савецкім Саюзам і ў 1991-1993 гадах — Расійскай арміяй. Гэтае пытанне Кабінет міністраў краіны павінен абмеркаваць падчас пасяджэння ў сераду.

## КОРАТКА

Беларусь зняла ліцэнзаванне імпарту ўкраінскага піва. Як паведамлялася, імпарт піва з Украіны ў Беларусь быў часова абмежаваны ў канцы 2010 года. У той час доля ўкраінскага піва дасягала 32 працэнтаў беларускага рынку, гэта імпартная прадукцыя мела больш прывабную цану, чым аналагічная айчынная.

Экспарцёрамі белага цукру ў Беларусі вызначаны чатыры прадпрыемствы: адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Гарадзейскі цукровы камбінат», «Жабінкаўскі цукровы завод», «Слуцкі цукрова-рафінадны камбінат» і «Скідзельскі цукровы камбінат». Гэта рашэнне дзейнічае з 20 мая да 20 лістапада 2012 года.

Памер арэнднай платы пасля ўступлення ў сілу з 1 красавіка ўказа № 150 «Аб некаторых пытаннях арэнды і бязвыплатнага карыстання маёмасцю» на рынках і ў гандлёвых цэнтрах Мінска павялічыўся ў сярэднім больш як у два разы. У сярэднім памер арэнднай платы за месцы па рэалізацыі харчовых тавараў павялічыўся да 19 еўра за 1 кв.м (было 8 еўра), нехарчовых — да 25 еўра (14) за 1 кв.м.

## ЦІ ПІШАЦЕ ВЫ ЗВЫЧАЙНЫЯ ПАПЯРОВЫЯ ЛІСТЫ АБО ЦАЛКАМ ПЕРАЙШЛІ НА ЭЛЕКТРОННУЮ ПЕРАПІСКУ?



**Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе (53 гады):**

— У працы дэпутата не абысціся без пісьмовых адказаў на пытанні выбаршчыкаў. Праўда, усе яны набіраюцца на камп'ютары і раздрукоўваюцца на прынтары. Лістоў ад рукі ўжо практычна не пішу. Нават са сваякамі даводзіцца мець зносіны ў асноўным з дапамогай тэлефона і электроннай пошты. А вось нашы выбаршчыкі, якія да нас звяртаюцца, пішуць лісты ў асноўным ад рукі — на паперы ў клетачку са школьных сшыткаў. Гэта і не дзіўна: многія з іх пажылога ўзросту, ім так больш звыкла.



**Віктар БАБАРЫКІН, мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь (33 гады):**

— У асноўным пішу электронныя лісты. Папяровыя пішу, толькі калі звяртаюся ў розныя ведамствы. Электронная перапіска — гэта вельмі хутка і зручна. Адпраўлены ліст літаральна на працягу секунды даходзіць да адрасата, нават калі той знаходзіцца на другім канцы свету. У дзень я адпраўляю да 8 электронных лістоў і вельмі цаню перавагі электроннай пошты.



**Аляксандра КАСЦЕВІЧ, студэнтка 3 курса Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій пры БДУ (20 гадоў):**

— Апошні ліст на паперы я адправіла гадоў 5 таму, былой аднакласніцы. Цяпер я таксама шмат перапісваюся, але ў асноўным гэта адбываецца ў сацыяльных сетках, з дапамогай камп'ютара. Або адпраўляю эсэмэскі па тэлефоне. І мне асабіста вельмі шкада, што электронная перапіска выцесніла папяровую. Бо папяровыя лісты атрымліваць значна больш прыемна, і вельмі прыемным з'яўляецца прадчуванне чакання, якое яны дораць. Але сучаснае жыццё такое, што электронныя лісты аказаліся зручнейшымі.

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

## Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў новую рэдакцыю Палажэння аб Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце

**Зацверджана новая рэдакцыя Палажэння аб Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Адпаведны ўказ № 237 «Аб некаторых пытаннях Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь» кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 21 мая.**

Дакумент прыняты ў мэтах далейшага ўдасканалення дзейнасці Дзяржінспекцыі і накіраваны на павышэнне эфектыўнасці дзяржаўнага кантролю за выкананнем законаў, рашэнняў Прэзідэнта, урада і іншых дзяржаўных органаў, якія рэгулююць адносіны аховы і выкарыстання аб'ектаў жывёльнага і расліннага свету, земляў.

Указам зацверджана новая рэдакцыя Палажэння аб Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, якая ўлічвае змяненні заканадаўства і вынікі яе практычнай дзейнасці. Таксама ўстаноўлены некаторыя новыя патрабаванні, якія датычацца арганізацый і грамадзян. Гэта, у прыватнасці, абавязак арганізацый і грамадзян ва ўстаноўлены тэрмін пісьмова інфармаваць Дзяржінспекцыю аб прынятых мерах па выкананні яе прадпісанняў і пастаноў; абавязак арганізацый — суб'ектаў нарматворчай дзейнасці ўзгадняць з Дзяржінспекцыяй праекты нарматыўных прававых актаў па пытаннях, аднесеных да яе кампетэнцыі.

Акрамя таго, устанаўліваецца права Дзяржінспекцыі ўносіць у дзяржаўныя органы, іншыя арганізацыі прапановы аб адмене (змяненні) прынятых імі прававых актаў у выпадку іх неадпаведнасці заканадаўству.

У новай рэдакцыі Палажэння больш дакладна вызначаны паўнамоцтвы Дзяржінспекцыі ў частцы дзяржаўнага кантролю за аховай і выкарыстаннем ляснога фонду і зямель пад дзікарослай драўнінна-хмызняковай расліннасцю.

Для актывізацыі работы са сродкамі масавай інфармацыі, інфармавання грамадскасці аб дзейнасці Дзяржінспекцыі ў яе структуру ўключана пасада прэс-сакратара.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

■ З першых вуснаў

# МЫТНЯ Ў ЧАКАННІ ПЕРАМЕН

**Аб пропуску па мытных «зялёным» і «чырвоным» калідорах, дэкларацыі ў выглядзе электроннага дакумента, іншых асаблівасцях і нюансах існавання Мытнага саюза «тройкі» наш карэспандэнт гутарыць з намеснікам старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь Сяргеем БАРЫСЮКОМ.**



**— Сяргей Валер'евіч, з 1 студзеня 2012 года мы жывём у Адзінай эканамічнай прасторы. Як гэтыя абставіны паўплывалі на дзейнасць Мытнага камітэта Беларусі?**

— Як вядома, фарміраванне Адзінай эканамічнай прасторы (АЭП) з'яўляецца адным з важных этапаў інтэграцыйных працэсаў у рамках Еўразійскай эканамічнай супольнасці. Яго першым этапам стала ўступленне сёлета ў сілу 17 міждзяржаўных пагадненняў, якія датычацца правядзення ўзгодненай макраэканамічнай палітыкі, усталявання адзіных прынцыпаў і правілаў дзейнасці натуральных манаполій, вызначэння адзіных прынцыпаў і правілаў канкурэнцыі, выкарыстання санітарных, ветэрынарных і фітасанітарных мер, прадастаўлення прамысловых субсідый у сферы тэхнічнага рэгулявання. АЭП — гэта больш цесная форма эканамічнай інтэграцыі. Яе мэта — правядзенне ўзгодненай падатковай, грашова-крэдытнай, валютна-фінансавай, гандлёвай і мытнай палітыкі. Стаіць задача забяспечыць свабодны рух не толькі тавараў, але і капіталаў, паслуг, працоўнай сілы. Таму наш Камітэт, як і іншыя органы дзяржаўнага кіравання, бачыць сваёй мэтай наступнае ўмацаванне ўзаемавыгаднага і раўнапраўнага супрацоўніцтва дзяржаў-членаў Мытнага саюза.

**— Якім чынам беларускія мытнікі могуць паспрыяць больш хуткаму перамяшчэнню тавараў айчынных вытворцаў за мяжу і тым самым зрабіць іх больш канкурэнтаздольнымі?**

— У першую чаргу шляхам укаранення ў практыку сучасных прынцыпаў дзейнасці, выкарыстання перадавых інфармацыйных тэхналогій, развіцця адпаведнай інфраструктуры, павышэння прафесійнага ўзроўню супрацоўнікаў. Гэта прыярытэтныя кірункі развіцця мытні Беларусі. Іх рэалізацыя ідзе, у тым ліку, і праз наладжванне партнёрскіх адносін з бізнэсам. Бо ў нас агульная мэта — наладзіць такі кантроль, каб праходжанне тавараў праз мяжу Мытнага саюза суправаджалася мінімальнымі стратамі часу. Мы надаём вялікую ўвагу і пытанням уніфікацыі мытных правілаў і працэдур, прынятых Сусветнай мытнай арганізацыяй.

Праведзена работа па далучэнні да Міжнароднай канвенцыі аб спрашчэнні і гарманізацыі мытных працэдур ад 18 мая 1973 года. Далучэнне да Канвенцыі стане дадатковым імпульсам для стымулявання ўзаемных тавarных патокаў, станоўча адаб'ецца на развіцці знешнегандлёвых сувязяў Беларусі з краінамі Еўрапейскага саюза, іншымі дзяржавамі, што ў цэлым дазволіць павысіць канкурэнтаздольнасць айчынных тавараў.

**— На якім этапе падрыхтоўкі знаходзіцца праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб мытным рэгуляванні ў Рэспубліцы Беларусь»?**

— Гэты праект распрацоўваецца з мэтай комплекснага прывядзення заканадаўства нашай краіны ў адпаведнасць з мытным заканадаўствам дзяржаў — членаў Мытнага саюза. Сваю частку работы над дакументам мы ў Камітэце ўжо завяршылі, цяпер над праектам працуюць спецыялісты больш як 40 міністэрстваў і ведамстваў краіны. Зараз яны аналізуюць шматлікія заўвагі і прапановы па ўдасканаленні праекта Закона. Яго ўнясенне на разгляд дэпутатаў парламента плануецца на сёлетні верасень. Хачу адзначыць, што кожны жадаючы мог пазнаёміцца з тэкстам праекта — для гэтага дастаткова было завітаць на афіцыйны сайт Дзяржаўнага мытнага камітэта. Увогуле мы вітаем грунтоўнае і зацікаўленае абмеркаванне законапраекта суб'ектамі гаспадарання, бізнэс-саюзамі, прадпрымальнікамі і грамадскасцю.

**— Пытанне ў працяг тэмы. Зараз распрацоўваецца новая рэдакцыя Мытнага кодэкса Мытнага саюза. Хто і дзе працуе над гэтым дакументам і аб якіх прынцыповых зменах ідзе размова?**

— Падрыхтоўка змен і дадаткаў у гэты дакумент вядзецца ў рамках спецыяльна створанай рабочай групы, якую ўзначальвае кіраўнік Федэральнай мытнай службы Расіі Андрэй Бельянінаў. У яе склад ад нашай краіны ўвайшлі прадстаўнікі Дзяржаўнага мытнага камітэта, міністэрстваў транспарту і камунікацый, фінансаў, эканомікі і прамысловасці. Наш Камітэт прызначаны ў Беларусі адказным ведамствам за гэтую работу. Яе плануецца завяршыць да канца першага паўгоддзя, а ўступленне ў сілу новай рэдакцыі Мытнага кодэкса Мытнага саюза плануецца з 1 студзеня 2013 года.

Усяго Беларуссю, Казахстанам, Расіяй і сакратарыятам Камісіі Мытнага саюза прапанавана для разгляду больш за 300 папраўак у Мытны кодэкс Мытнага саюза з улікам вынікаў маніторынгу і практычнага выкарыстання. У кодэкс будзе ўключана максімальная колькасць нормаў прамога дзеяння, палажэнні асобных міжнародных дамоў дзяржаў — членаў Мытнага саюза і рашэнняў Камісіі Мытнага саюза ў галіне мытнага рэгулявання. Мы разлічваем, што гэта дазволіць спрасціць мытнае рэгуляванне ў межах АЭП. Неабходна падкрэсліць, што пры ўнясенні змен і дадаткаў у кодэкс яго структура, а таксама закладзеныя ў ім асноўныя прынцыпы і паняційны апарат застануцца нязменнымі.

**— Заўсёды мытныя плацяжы былі адной з важных крыніц папаўнення дзяржаўнага бюджэту. Як цяпер, калі мытны кантроль вынесены на знешнія межы «тройкі», адбываецца размеркаванне гэтых плацяжоў? Ці не страціць Беларусь частку сваіх даходаў?**

— Згодна з Пагадненнем аб устанаўленні і прымяненні ў Мытным саюзе парадку залічэння і размеркавання ўвазных мытных пошлін (іншых пошлін, падаткаў і збораў, якія маюць эквівалентнае дзеянне) падпісаным у Санкт-Пецярбургу ў маі 2010 года, нарматывы размеркавання сум увазных мытных пошлін усталяваны ў наступных памерах: Беларусь — 4,70%, Казахстан — 7,33%, Расія — 87,97%. За перыяд з уступлення ў сілу Пагаднення бюджэт Беларусі не панёс страт, якія былі б выкліканы выкарыстаннем механізму размеркавання ўвазных мытных пошлін.

**— Час ад часу на тэлеканалах дэманструюцца поўныя драматызму рэпартажы аб кіламетровых чэргах грузавых і легкавых аўтамабіляў на мяжы то з Польшчай, то з Літвой. Што робіцца для таго, каб такіх чэргаў было як мага менш?**

— Зразумела, мы імкнёмся хутка і адэкватна рэагаваць. Дзеянні нашай мытнай службы залежаць ад характару ўзнікнення чэргаў. Калі яны ўтвараюцца на выездзе з Беларусі, то гэта, як правіла, па прычыне запаволенага прыёму транспартных сродкаў сумежным бокам. Мы ўжо дамовіліся з мытнымі службамі Літвы, Латвіі, Польшчы і Украіны аб мінімальнай сутачнай колькасці апрацоўкі транспартных сродкаў на сваім баку мяжы. Калі чэргі ўтвараюцца на ўездзе ў Беларусь, то мытнай службай сумесна з пагранічнай службай прымаюцца меры па павелічэнні колькасці асабовага складу падраздзяленняў, выдзяляюцца дадатковыя месцы для стаянак транспарту.

**— Чаму былі ліквідаваны Мазырская і Пінская мытні?**

— У мэтах стварэння аптымальнай арганізацыйна-штатнай структуры, якая адпавядала б сённяшнім рэаліям работы мытнікаў. Размова ідзе аб паэтапнай пабудове сістэмы мытных органаў па рэгіянальным прынцыпе. Таму з 1 студзеня г. г. былі рэарганізаваны Брэсцкая мытня (шляхам далучэння да яе Пінскай) і Гомельская мытня — да яе далучана Мазырская.

**— Як вядома, грамадзяне краін Еўрапейскага саюза карыстаюцца істотнымі перавагамі пры перасячэнні мяжы ЕС. Ці будуць такія «зялёныя калідоры» наладжаны ў Мытным саюзе для грамадзян Беларусі, Расіі і Казахстана?**

— Згодна з рашэннем камісіі Мытнага саюза, для грамадзян дзяржаў, членаў «тройкі», ёсць магчымасць перасякаць мяжу па асобным канале. Заканадаўства дазваляе перамяшчаць па «зялёным» калідоры асабістую маёмасць грамадзянам Беларусі, Расіі і Казахстана. А вось іншаземцы, якія едуць на транспартных сродках, зарэгістраваных у іншых дзяржавах, рухаюцца па «чырвоным» калідоры. Але тут трэба мець на ўвазе, што праз пункты пропуску на беларускім участку мытнай мяжы Мытнага саюза ў асноўным перамяшчаюцца грамадзяне Беларусі. Таму, каб прадухіліць стварэнне чэргаў у пунктах пропуску з ліку нашых суайчыннікаў (калі іх асноўная маса будзе рухацца па спецыяльным канале, а грамадзяне замежных дзяржаў апынуцца ў больш выйгрышным становішчы), вырашана пакуль не рабіць асобны канал для грамадзян дзяржаў — членаў Мытнага саюза. Іх пропуск па «зялёным» і «чырвоным» калідорах вядзецца ў залежнасці ад тавару, які перавозіцца.

**— Наколькі рэальна ў бліжэйшай перспектыве ў межах Мытнага саюза ўкараніць электроннае дэклараванне тавараў і транспартных сродкаў?**

— У мытных органах Беларусі яно ўведзена ўжо з 2008 года. Наша сістэма стваралася з улікам досведу краін Еўрасаюза, Расіі і сёння развіваецца паэтапна ў цесным узаемадзеянні з дзяржавамі — членамі Мытнага саюза. Мы ўніфікавалі і зацвердзілі патрабаванні да электронных фарматаў і структур мытных дакументаў. Гэтыя патрабаванні адзіныя і абавязковыя да ўжывання на ўсёй тэрыторыі Мытнага саюза. Наладжаны абмен інфармацыяй у электронным выглядзе па асноўных мытных працэсах (транзіт, часовы ўвоз і інш.). Зацверджана Інструкцыя аб парадку прадастаўлення і выкарыстанні мытнай дэкларацыі ў выглядзе электроннага дакумента.

Разам з тым, адзначу, што ўкараненне электроннага дэкларавання ў поўным аб'ёме на ўсёй тэрыторый «тройкі» — працэс не просты і не хуткі. У першую чаргу гэта звязана з неабходнасцю ўніфікацыі на ўзроўні трох дзяржаў заканадаўства, якое рэгулюе пытанні выкарыстання электронных дакументаў, узаемнага прызнання электроннага лічбавага подпісу. І тут удзелу і кампетэнцыі толькі мытных органаў недастаткова. Для рашэння гэтых пытанняў створаны міжнародныя рабочыя групы, у якія ўвайшлі эксперты розных міністэрстваў і ведамстваў. З іх дапамогай выпрацоўваюцца адзіныя падыходы і рэкамендацыі па абарачэнні электронных дакументаў.

**— Заўсёды былі і, напэўна, будуць аматары падмануць мытнікаў, рэалізаваць «шэрыя» схемы нелегальнага прасоўвання вялікіх партый грузаў праз мяжу. Як наша мытня procістаіць гэтым злачынным спробам?**

— Не баючыся паказацца нясціплым, скажу: рашуча і даволі вынікова. Вось некалькі лічбаў і прыкладаў. Летась мытнікі зафіксавалі каля 20 тысяч парушэнняў заканадаўства, аб'ёмы затрымання прадметаў кантрабанды падвоіліся. У першым квартале гэтага года нашы мытнікі спынілі каля 5 тысяч парушэнняў заканадаўства, у тым ліку заведзена 21 крымінальная справа па фактах кантрабанды наркотыкаў, зброі і боепрыпасаў, фактах камерцыйнага махлярства. За першыя 3 месяцы гэтага года з незаконнага абарачэння выключана больш як 5,5 кг наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў, 13 адзінак розных відаў зброі.

Яркім прыкладам эфектыўнай работы мытнай службы Беларусі лічу выяўленне і спыненне схем кантрабанднага ўвозу на тэрыторыю «тройкі» розных катэгорый тавараў. Так, у лютым супрацоўнікі Ашмянскай мытні сумесна з пагранічнікамі затрымалі буйную партыю наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў. Больш як 3,5 кг было схавана на целе грамадзянкі Расіі, якая пешшу рухалася з Літвы ў Беларусь. Варта адзначыць, што сёлета па-ранейшаму шмат затрымліваецца пастаўшчыкоў кантрабандных цыгарэт. Іх спрабуюць незаконна перавезці праз нашу мяжу ў краіны Балтыі і далей у Еўропу. Лік кантрабандных цыгарэт ідзе на дзясяткі мільёнаў штук. У сакавіку супрацоўнікамі Віцебскай мытні сумесна з пагранічнікамі ў пункце мытнага афармлення «Бігосава-1» у паўпрычэпах двух грузавых аўтамабіляў «MAN» і «SKANIA», якія рухаліся з Беларусі ў Літву, былі знойдзены і канфіскаваны схаваныя ад кантролю цыгарэты — каля 2 млн штук.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА**



# РАСКЛАД РУХУ ЭЛЕКТРАЦЯГНІКОЎ з 27 мая 2012 года

**УП «Мінскае аддзяленне Беларускай чыгункі» ІНФАРМУЕ:**
***з 27 мая ўстанаўліваецца наступны расклад руху электрацягнікоў***

### ➤ На Маладзечна

*Прамыя беспераcадачныя зносіны (інфармацыя аб наяўнасці прыпынкаў гэтым цягнікам знаходзіцца ў прыведзенай ніжэй табліцы)*

**— эл.ц. Барысаў—Маладзечна адпр. са ст. Барысаў 04-35, Мінск-Пас. 06.20-06.35, прыб. на ст. Маладзечна ў 08.19 (штодзень);**

**— эл.ц. Асіповічы—Маладзечна адпр. са ст. Асіповічы 05-22, Мінск-Пас. 07.24-07.35, прыб. на ст. Маладзечна ў 09.28 (штодзень);**

**— эл.ц. Пухавічы—Аляхновічы адпр. са ст. Пухавічы 9.03, Мінск-Пас. 10.20-10.50, прыб. на ст. Аляхновічы ў 11.59 (па выхадных).**

#### Адпраўленне са станцыі МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

| Маршрут | Час адпраўлення са станцыі Мінск-Пасажырскі | Час прыбыцця на канцавую станцыю | Дні | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Маладзечна | 0-25 | 2-05 | штодня | б/п Лябяжы, Татаршчызна, Селівонаўка |
| Маладзечна | 4-37 | 6-09 | штодня | б/п Лябяжы, М. Мора, Крыжоўка, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі |
| Беларусь | 5-05 | 5-39 | штодня | усюды |
| Маладзечна | 5-18 | 7-09 | штодня | б/п Лябяжы |
| Ждановічы | 5-30 | 5-46 | штодня | усюды |
| Маладзечна — Гудагай д/ц | 6-10 | 07-32 / 9-02 | штодня | да Маладзечна — без прыпынкаў, да ст.Смаргонь — з усімі прыпынкамі, далей з прып. па ст. Солы, Ашмяны |
| Беларусь | 6-24 | 6-58 | штодня | усюды |
| Маладзечна | 6-35 | 8-19 | штодня | б/п Крыжоўка |
| Аляхновічы | 6-51 | 8-00 | штодня | усюды |
| Ждановічы | 7-04 | 7-19 | штодня | усюды |
| Беларусь | 7-25 | 7-59 | штодня | усюды |
| Маладзечна | 7-35 | 9-28 | штодня | усюды |
| Ждановічы | 8-05 | 8-21 | штодня | усюды |
| Аляхновічы | 8-19 | 9-27 | вых. | усюды |
| Маладзечна | 8-35 | 10-22 | штодня | усюды |
| Беларусь | 8-48 | 9-22 | штодня | усюды |
| Ждановічы | 9-15 | 9-31 | штодня | усюды |
| Маладзечна | 9-28 | 11-15 | штодня | усюды |
| Ждановічы | 9-40 | 9-56 | штодня | усюды |
| Аляхновічы | 9-49 | 11-02 | вых. | усюды |
| Ждановічы | 10-05 | 10-21 | штодня | усюды |
| Маладзечна | 10-21 | 12-10 | штодня | усюды |
| Ждановічы | 10-35 | 10-51 | штодня | усюды |
| Аляхновічы | 10-50 | 11-59 | вых. | усюды |
| Ждановічы | 11-00 | 11-16 | штодня | усюды |
| Ждановічы | 11-20 | 11-36 | штодня | усюды |
| Маладзечна | 11-32 | 13-18 | штодня | усюды |
| Ждановічы | 12-10 | 12-26 | штодня | усюды |
| Аляхновічы | 12-17 | 13-27 | вых. | усюды |
| Маладзечна | 12-44 | 14-33 | штодня | усюды |
| Ждановічы | 13-00 | 13-16 | штодня | усюды |
| Беларусь | 13-25 | 13-59 | штодня | усюды |
| Маладзечна | 13-37 | 15-23 | штодня | усюды |
| Ждановічы | 14-05 | 14-21 | штодня | усюды |
| Маладзечна | 14-16 | 16-02 | пт., вых. | б/п Селівонаўка |
| Ждановічы | 15-00 | 15-16 | штодня | усюды |
| Уша | 15-07 | 16-33 | пт., нядз. | усюды |
| Ждановічы | 15-25 | 15-41 | штодня | усюды |
| Маладзечна | 15-36 | 17-24 | штодня | усюды |
| Ждановічы | 15-50 | 16-06 | штодня | усюды |
| Беларусь | 16-00 | 16-34 | штодня | усюды |
| Аляхновічы | 16-09 | 17-24 | пт., вых. | усюды |
| Маладзечна | 16-33 | 18-18 | штодня | усюды |
| Ждановічы | 16-46 | 17-02 | штодня | усюды |
| Ждановічы | 17-05 | 17-21 | штодня | усюды |
| Аляхновічы | 17-27 | 18-37 | штодня | усюды |
| Беларусь | 17-40 | 18-14 | штодня | усюды |
| Маладзечна — Гудагай д/ц | 17-53 | 19-29 / 20-56 | штодня | з прыпынкамі па ст. Маладзечна, Пруды, Залессе, Смаргонь, Солы, Ашмяны і п.п. Маладзёжны |
| Маладзечна | 18-00 | 19-35 | штодня | б/п Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі, Раманы |
| Маладзечна | 18-14 | 20-01 | штодня | б/п Масюкоўшчына, Лябяжы, М. Мора, Крыжоўка |
| Беларусь | 18-22 | 18-56 | штодня | усюды |
| Ждановічы | 18-39 | 18-55 | штодня | усюды |
| Беларусь | 19-10 | 19-44 | штодня | усюды |
| Маладзечна | 19-27 | 21-13 | штодня | усюды |
| Ждановічы | 19-46 | 20-02 | штодня | усюды |
| Аляхновічы | 20-18 | 21-27 | штодня | усюды |
| Маладзечна | 20-47 | 22-44 | штодня | усюды |
| Маладзечна | 22-04 | 23-43 | штодня | б/п Мясота, Татаршчызна, Крыніца, Селівонаўка |

— цягнік гарадскіх ліній
д/ц — дызель-цягнік

#### Адпраўленне з п.п. МІНСК-ПАЎНОЧНЫ

| Маршрут | Адпраўленне з п.п. Мінск-Паўночны | Прыбыццё на канцавую станцыю | Дні | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Аляхновічы | 6-02 | 7-17 | штодня | усюды |
| Аляхновічы | 9-09 | 10-14 | вых. | усюды |
| Аляхновічы | 13-15 | 14-19 | вых. | усюды |
| Аляхновічы | 18-33 | 19-45 | штодня | усюды |

### ➤ На Асіповічы

*Прамыя беспераcадачныя зносіны (інфармацыя аб наяўнасці прыпынкаў гэтым цягнікам знаходзіцца ў прыведзенай ніжэй табліцы)*

**— эл.ц. Маладзечна—Пухавічы адпр. са ст. Маладзечна 05.03, Мінск-Пас. 07.02-07.10, прыб. на ст. Пухавічы ў 08.20 (па выхадных днях);**

**— эл.ц. Маладзечна—Асіповічы адпр. са ст. Маладзечна 06.29, Мінск-Пас. 08.14-08.26, прыб. на ст. Асіповічы ў 10.43 (штодзень);**

**— эл.ц. Стоўбцы—Талька адпр. са ст. Стоўбцы 08.17, Мінск-Пас. 09.57-10.10, прыб. на ст. Талька ў 11.51 (па выхадных днях);**

**— эл.ц. Маладзечна—Асіповічы адпр. са ст. Маладзечна 08.34, Мінск-Пас. 10.31-10.45, прыб. на ст. Асіповічы ў 12.51 (па выхадных днях).**

#### Адпраўленне са станцыі МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

| Маршрут | Час адпраўлення са станцыі Мінск-Пасажырскі | Прыбыццё на канцавую станцыю | Дні | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Пухавічы | 0-19 | 1-30 | штодня | б/п Вендзеж, Тэхнікум |
| Асіповічы | 5-05 | 7-08 | штодня | б/п Чыгуначны |
| Рудзенск | 5-32 | 6-09 | акрамя суб., нядз. | б/п Чыгуначны, Асееўка, Седча, Зазерка, Рыбцы, Раўнаполле |
| Пухавічы | 6-41 | 7-44 | прац. | б/п Лошыца, Чыгуначны, Седча, Зазерка, Раўнаполле, Новае Сяло, Дрычын, Тэхнікум |
| Асіповічы | 6-48 | 8-49 | штодня | б/п Вендзеж |
| Пухавічы | 7-10 | 8-20 | вых. | б/п Чыгуначны, Асееўка, Зазерка |
| Калядзічы | 7-15 | 7-29 | акрамя суб., нядз. | б/п Чыгуначны |
| Талька | 7-59 | 9-38 | штодня | усюды |
| Асіповічы | 8-26 | 10-43 | штодня | усюды |
| Пухавічы | 9-08 | 10-25 | вых. | усюды |
| Асіповічы | 9-23 | 11-29 | штодня | усюды |
| Талька | 10-10 | 11-51 | вых. | усюды |
| Асіповічы | 10-45 | 12-51 | вых. | усюды |
| Асіповічы | 12-01 | 14-06 | штодня | усюды |
| Талька | 12-54 | 14-33 | вых. | усюды |
| Асіповічы | 13-24 | 15-29 | штодня | усюды |
| Талька | 13-38 | 15-17 | вых. | усюды |
| Асіповічы | 14-16 | 16-19 | штодня | усюды |
| Асіповічы | 15-22 | 17-34 | штодня | усюды |
| Талька | 16-16 | 18-06 | штодня | усюды |
| Пухавічы | 16-48 | 17-52 | пт., вых. | б/п Чыгуначны, Зазерка, Рыбцы, Раўнаполле, Новае Сяло, Вендзеж |
| Калядзічы | 17-07 | 17-21 | акрамя пт., суб., нядз. | б/п Чыгуначны |
| Талька | 17-24 | 19-02 | штодня | усюды |
| Асіповічы | 17-44 | 19-43 | штодня | б/п Вярхі |
| Талька | 18-03 | 19-40 | пт., вых. | б/п Чыгуначны |
| Рудзенск | 18-08 | 18-44 | акрамя пт., суб., нядз. | б/п Чыгуначны, Асееўка, Седча, Зазерка, Рыбцы, Раўнаполле |
| Пухавічы | 18-23 | 19-40 | штодня | усюды |
| Асіповічы | 18-42 | 20-27 | штодня | б/п Чыгуначны, Асееўка, Раўнаполле, Н.Сяло, Дрычын, Вендзеж, Блужа, Весялоўскі, Вярхі |
| Асіповічы | 19-28 | 21-30 | штодня | б/п Вярхі |
| Пухавічы | 20-19 | 21-37 | штодня | усюды |
| Асіповічы | 20-46 | 23-00 | штодня | б/п Вярхі |

#### Адпраўленне з п.п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ

| Маршрут | Адпраўленне з п.п. Інстытут культуры | Прыбыццё на канцавую станцыю | Дні | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Асіповічы | 6-09 | 8-12 | штодня | б/п Чыгуначны, Вярхі |
| Асіповічы | 22-31 | 0-29 | штодня | б/п Вендзеж, Веленскі, Весялоўскі, Вярхі |

### ➤ На Брэст

*Прамыя беспераcадачныя зносіны (інфармацыя аб наяўнасці прыпынкаў гэтым цягнікам знаходзіцца ў прыведзенай ніжэй табліцы)*

**— эл.ц. Асіповічы—Брэст адпр. са ст. Асіповічы ў 07.41, Мінск-Пас. 09.32-09.47, прыб. на ст. Брэст у 16.46 (штодзень);**

**— эл.ц. Асіповічы—Баранавічы адпр. са ст. Асіповічы ў 11.53, Мінск-Пас. 13.37-13.52, прыб. на ст. Баранавічы ў 16.40 (па выхадных днях);**

**— эл.ц. Пухавічы—Баранавічы адпр. са ст. Пухавічы 20.05, Мінск-Пас. 21.23-21.33, прыб. на ст. Баранавічы ў 23.56 (штодзень);**

**— эл.ц. Асіповічы—Стоўбцы адпр. са ст. Асіповічы 20.45, Мінск-Пас. 22.49-23.01, прыб. на ст. Стоўбцы ў 00.28 (штодзень);**

**— эл.ц. Барысаў—Стоўбцы адпр. са ст. Барысаў 20.27, Інстытут культуры 22.04-22.22, прыб. на ст. Стоўбцы ў 23.57 (штодзень).**

#### Адпраўленне са ст. МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

| Маршрут | Час адпраўлення са станцыі Мінск-Пасажырскі | Прыбыццё на канцавую станцыю | Дні | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Баранавічы | 4-26 | 6-59 | штодня | б/п Пціч, Воўчкавічы, Бярэжа, Пяцігор'е, Станькава, Дзяржынск, Клыпаўшчына, Асіна, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Цёмныя Ляды |
| Стоўбцы | 7-54 | 9-55 | штодня | усюды |
| Брэст | 9-47 | 16-46 | штодня | усюды |
| Баранавічы | 13-52 | 16-40 | штодня | усюды |
| Баранавічы | 15-38 | 17-47 | штодня, акрамя пт. | з прыпынкамі: п.п. Курасоўшчына, ст. Фаніпаль, Койданава, Дзяржынск, Негарэлае, Энергетык, Коласава, Стоўбцы, Гарадзея, Хвоева, Пагарэлцы, п.п. Пост 1 |
| Брэст | 15-38 | 20-58 | пт. | з прыпынкамі: п.п. Курасоўшчына, ст. Фаніпаль, Койданава, Дзяржынск, Негарэлае, Энергетык, Коласава, Стоўбцы, Гарадзея, Пагарэльцы, Хвоева, Пост 1; ад ст.Баранавічы — б/п Лакаматыўнае дэпо, Быцень, Боркі, ад ст. Бяроза-Картуская да Брэста з прыпынкамі па станцыях |
| Брэст | 16-20 | 22-55 | штодня | б/п Мезінаўка, Кучкуны |
| Стоўбцы | 17-47 | 19-35 | штодня | усюды |
| Стоўбцы | 18-39 | 20-18 | штодня | усюды |
| Баранавічы | 20-20 | 23-14 | штодня | б/п Сінява, Асіпоўшчына, Ліпа, Юшкевічы, Перамога, Крошына |
| Баранавічы | 21-33 | 23-56 | штодня | б/п Асіна, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Ц. Ляды, Сінява, Асіпоўшчына, Вароцішча, Ліпа, Хвоева, Пагарэльцы, Юшкевічы, Перамога, Крошына |
| Стоўбцы | 23-01 | 0-28 | штодня | б/п Асіна, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Ц. Ляды |

#### Адпраўленне з п.п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ

| Маршрут | Адпраўленне з п.п. Інстытут культуры | Прыбыццё на канцавую станцыю | Дні | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Брэст | 0-49 | 7-30 | штодня | б/п Рошча, Пціч, Бярэжа, Пяцігор'е, Станькава, Клыпаўшчына, Асіна, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Ц.Ляды, Сінява, Асіпоўшчына, Вароцішча, Ліпа, Хвоева, Юшкевічы, Перамога, Крошына, Пост 1 |
| Стоўбцы | 5-51 | 7-35 | штодня | усюды |
| Брэст | 7-00 | 13-51 | штодня | усюды |
| Стоўбцы | 7-38 | 9-13 | вых. | усюды |
| Баранавічы | 8-56 | 11-32 | штодня | б/п Сінява, Асіпоўшчына, Вароцішча, Ліпа, Крошына |
| Стоўбцы | 9-17 | 10-54 | вых. | усюды |
| Стоўбцы | 10-20 | 11-55 | вых. | усюды |
| Стоўбцы | 10-54 | 12-31 | вых. | усюды |
| Брэст | 11-57 | 18-45 | штодня | усюды |
| Стоўбцы | 13-10 | 14-53 | штодня | усюды |
| Стоўбцы | 14-44 | 16-30 | прац. | усюды |
| Гарадзея | 14-44 | 16-54 | вых. | усюды |
| Стоўбцы | 16-44 | 18-19 | пт., нядз. | усюды |
| Баранавічы | 17-10 | 20-24 | штодня | усюды |
| Баранавічы | 19-15 | 22-00 | штодня | усюды |
| Стоўбцы | 22-22 | 23-57 | штодня | усюды |

### ➤ На Оршу

*Прамыя беспераcадачныя зносіны (інфармацыя аб наяўнасці прыпынкаў гэтым цягнікам знаходзіцца ў прыведзенай ніжэй табліцы)*

**— эл.ц. Стоўбцы—Барысаў адпр. са ст. Стоўбцы 05.27, Інстытут культуры 07.03-7.20, прыб. на ст. Барысаў у 09.09 (штодзень)**

#### Адпраўленне з п.п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ

| Маршрут | Адпраўленне з п.п. Інстытут культуры | Прыбыццё на канцавую станцыю | Дні | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Орша (стаянка па ст. Барысаў 2-00 — 4-30) | 0-34 | 6-59 | штодня | б/п Дамашаны, Барсукі, Прал. Перамога |
| Барысаў | 4-51 | 6-14 | штодня | б/п Слабада, Дамашаны, Загор'е, Барсукі |
| Орша | 5-17 | 9-01 | штодня | б/п Галашоўка, Дзятлава, Ламачына |
| Орша | 6-30 | 10-29 | штодня | усюды |
| Барысаў | 7-20 | 9-09 | штодня | усюды |
| Барысаў | 8-06 | 9-40 | штодня | усюды |
| Барысаў | 8-42 | 10-27 | штодня | усюды |
| Орша | 9-36 | 13-26 | вых. | усюды |
| Барысаў | 10-19 | 11-54 | вых. | усюды |
| Орша | 10-52 | 14-50 | штодня | усюды |
| Барысаў | 11-20 | 12-54 | вых. | усюды |
| Барысаў | 12-15 | 13-50 | штодня | усюды |
| Орша | 13-04 | 16-55 | штодня | усюды |
| Орша | 14-39 | 19-01 | штодня | усюды |
| Барысаў | 15-40 | 17-14 | штодня | усюды |
| Барысаў | 16-57 | 18-32 | штодня | усюды |
| Барысаў | 17-26 | 19-10 | штодня | усюды |
| Орша | 18-33 | 22-23 | штодня | б/п Выдзершчына, Пераваланчны, Галашоўка, Дзятлава, Ламачына |
| Барысаў | 19-39 | 21-22 | штодня | усюды |
| Барысаў | 20-24 | 21-57 | штодня | усюды |
| Барысаў | 21-54 | 22-59 | штодня | з прыпынкамі Мінск-Усходні, Зарэчнае, Жодзіна-Паўднёвае, Печынскі |

#### Адпраўленне з п.п. МІНСК-ПАЎДНЁВЫ

| Маршрут | Адпраўленне з п.п. Мінск-Паўднёвы | Прыбыццё на канцавую станцыю | Дні | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Барысаў | 14-15 | 15-43 | штодня | усюды |
| Орша | 16-29 | 20-36 | штодня | усюды |
| Барысаў | 22-30 | 00-06 | штодня | усюды |

***Расклад руху электрацягнікоў у зваротным накірунку чытайце ў наступных нумарах.***

## З МІНІСТРАМ АБАРОНЫ — НАПРАМУЮ!

**24 мая 2012 года Міністр абароны Рэспублікі Беларусь генерал-лейтэнант Жадобін Юрый Віктаравіч правядзе «прамую тэлефонную лінію» з насельніцтвам.**

**Задаць пытанне міністру абароны можна будзе з 10.00 да 11.00 па тэлефоне (8 017) 297 29 20.**

# ТРЫ САМЫЯ ЧАСТЫЯ ПЫТАННІ НАПЯРЭДАДНІ ВОДПУСКУ

**На пачатку сезона водпускаў мы задалі тры пытанні на тэму правільнага яго афармлення начальніку юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валянціне МАСЛОЎСКАЙ.**

### *КАЛІ ПАВІННЫ БЫЦЬ ВЫПЛАЧАНЫ АДПУСКНЫЯ?*

Наймальнік абавязаны выплаціць адпускныя не пазней чым за два дні да пачатку водпуску (арт. 176 Працоўнага кодэкса). Супрацоўнікам, якія працуюць на аснове кантракта, адпускныя павінны быць выплачаны не пазней чым за адзін дзень да пачатку адпачынку.

### *ЯК РАЗЛІЧВАЕЦЦА ПАМЕР АДПУСКНЫХ?*

Адпускныя вылічаюцца, зыходзячы з заробку за 12 каляндарных месяцаў (з 1-га да 1-га чысла), якія папярэднічаюць месяцу пачатку адпачынку, незалежна ад таго, за які працоўны год прадастаўляецца водпуск. Памер адпускных вызначаецца шляхам множання сярэднядзённага заробку на колькасць каляндарных дзён водпуску.

У сваю чаргу, сярэднядзённы заробак вызначаецца шляхам дзялення заработнай платы, фактычна налічанай работніку за месяцы, якія прымаюцца для вылічэння адпускных, на лік гэтых месяцаў і на сярэднямесячную колькасць каляндарных дзён (29,7 дня).

### *ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ НАЙМАЛЬНІК НЕ ВЫПЛАЧВАЕ АДПУСКНЫЯ СВОЕЧАСОВА?*

У выпадку невыканання тэрмінаў выплаты адпускных работнік мае права працягнуць працу (гэта значыць, не сыходзіць у адпачынак), пісьмова паведаміўшы наймальніку аб прычынах свайго ўчынку. У адпаведнасці з пунктам 5 часткі 1 артыкула 171 ПК працоўны водпуск у такім выпадку можа быць падоўжаны або перанесены па жаданні працаўніка на іншы час бягучага працоўнага года, вызначаны па дамоўленасці паміж работнікам і наймальнікам.

Дарэчы, несвоечасовая выплата адпускных лічыцца парушэннем тэрмінаў выплаты заработнай платы.

**Святлана БУСЬКО.**

## Аб водпуску лепш дамаўляцца па-добраму

***Ці мае права наймальнік прымяніць да работніка меры дысцыплінарнай адказнасці за тое, што той адмаўляецца сыходзіць у адпачынак згодна з графікам водпускаў, а пагадненне аб пераносе часткі водпуску, замене часткі водпуску грашовай кампенсацыяй не дасягнута?*** (**Замулка М.Г.**, *г. Мінск*)

**Адказвае начальнік юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валянціна МАСЛОЎСКАЯ:**

Згодна з арт. 53 Працоўнага кодэкса работнік абавязаны падпарадкоўвацца правілам унутранага працоўнага распарадку, іншым дакументам, якія рэгламентуюць пытанні дысцыпліны працы, выконваць пісьмовыя і вусныя загады (распараджэнні) наймальніка, якія не супярэчаць заканадаўству, і лакальным нарматыўным прававым актам.

Працоўны распарадак для работнікаў вызначаецца:

1) правіламі ўнутранага працоўнага распарадку, калектыўнымі дагаворамі, пагадненнямі, палажэннямі і інструкцыямі па ахове працы і іншымі лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі;
2) штатным раскладам;
3) службовымі інструкцыямі работнікаў;
4) графікамі работ (зменнасці);
5) графікамі водпускаў.

Такім чынам, калі графік працоўных водпускаў складзены ў адпаведнасці з нормамі заканадаўства аб працы, работнік не можа адмовіцца ад сыходу ў працоўны водпуск (за выключэннем выпадкаў пераносу адпачынку ў адпаведнасці з арт. 171 Працоўнага кодэкса).

У выпадку адмовы наймальніка перанесці тэрмін прадастаўлення працоўнага водпуску, вызначанага графікам працоўных водпускаў, а таксама пры неабгрунтаванай адмове работніка ісці ў працоўны водпуск у пэўны тэрмін на падставе загаду наймальніка (выдадзенага на падставе графіка працоўных водпускаў), магчыма прымяненне адной з мер дысцыплінарнага пакарання.

Варта таксама адзначыць наступнае: артыкулам 173 Працоўнага кодэкса прадугледжана, што калі працоўны водпуск прадастаўлены з захаваннем вызначанага парадку, але работнік адмаўляецца выкарыстоўваць адпачынак у вызначаны для яго тэрмін без законных падстаў, **наймальнік мае права адмовіць работніку ў пераносе адпачынку і не выплачваць грашовую кампенсацыю за нявыкарыстаны водпуск, акрамя выпадку звальнення (частка першая артыкула 179 ПК).**

**УВАГА**

***Працоўны водпуск работніку прадастаўлены з захаваннем вызначанага парадку, калі:***

— ён прадастаўлены ў адпаведнасці з графікам працоўных адпачынкаў;

— работнік папярэджаны за 15 дзён да пачатку адпачынку;

— падрыхтавана да выплаты сярэдняя заработная плата за час адпачынку не пазней чым за 2 дні да пачатку адпачынку;

— няма законных падстаў, а таксама дамоўленасці бакоў аб пераносе водпуску ў межах бягучага працоўнага года або на іншы працоўны год згодна з арт. 170, 171 ПК.

**Святлана БУСЬКО.**

**Филиал «Грузовой автомобильный парк № 3» ОАО «Миноблавтотранс»** вносит изменения в публикацию о проведении открытого аукциона по продаже недвижимого имущества: здания автокассы и асфальтобетонного покрытия, опубликованной в газете «Звязда» (17 мая 2012 года № 92).

Внести следующие изменения: «**Конечный срок и адрес приема заявок: 23.05.2012 г. до 16.00** Минская область, г. Солигорск, Любанское шоссе, Филиал «Грузовой автомобильный парк № 3», тел. 8 0174 200 530, факс: 8 0174 200 800, тел. 8 017 294 13 95.

УНП 601070302

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Ермаковай Надзеі Андрэеўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Калектыў адкрытага акцыянернага таварыства «Беларуская валютна-фондавая біржа» выказвае глыбокае спачуванне Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Надзеі Андрэеўне Ермаковай у сувязі з напаткаўшым яе горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Калектыў установы адукацыі «Палескі дзяржаўны ўніверсітэт» выказвае шчырыя спачуванні Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Ермаковай Надзеі Андрэеўне ў сувязі з напаткаўшым яе горам — смерцю БАЦЬКІ.**

# Выбарчая акруга Алега Ката

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Такая дапамога аказваецца, калі пажар адбыўся не па віне гаспадароў. Для гэтага неабходна, каб райвыканкам вынес рашэнне аб выдзяленні ў Мінскім лясгасе драўніны на корані, яна будзе значна таннейшай...

Дэпутат на некалькі хвілін выйшаў, каб нешта ўдакладніць па гэтым пытанні, і мы засталіся з наведвальнікам сам-насам. Я распытала яго пра заробкі, пра месца працы, пра ўзрост дзяцей і зразумела, чаму ён не выбраў у свой час увесь крэдыт: яны падлічылі, што большую суму вяртаць іх сям'і будзе не пад сілу. Яны тады не ведалі, што дзяржава кампенсуе частку працэнтаў.

Раптам я заўважыла, што вочы гэтага мужчыны напоўніліся слязьмі. На імгненне ён не справіўся з эмоцыямі. Атрымаць надзею ў яго становішчы — дарагога каштуе. Мне ён сказаў толькі: «Алег Іванавіч — чалавек на сваім месцы! Я нават не спадзяваўся, проста не ведаў, што рабіць...»

## «ЗМРОЧНЫ» ПОЛК

— Неяк мяне спытаў журналіст: «Ці праўда, што дэпутаты выдаткоўваюць на законапраект 16 хвілін?» — скарыстаўся Алег Іванавіч некалькімі хвілінамі да прыходу наступнага наведвальніка. — У адказ я запрасіў яго на пасяджэнне працоўнай групы і папярэдзіў: «Калі там будуць спрачацца на працягу 5 гадзін па нейкім пункце законапраекта і калі вы там пачуеце не толькі літаратурную мову, а назаўтра зноў тое самае, то не крыўдуйце!»

Законапраект пра зброю ў першым чытанні быў адзін, а ў другім чытанні — зусім іншы, змены адбыліся значныя, прыводзіць ён свежы прыклад. Першапачаткова, па меркаванні дэпутата, была спроба лабіравання інтарэсаў Дэпартамента аховы: прапаноўвалася ўсталяваць сігналізацыю на кватэры, дзе захоўваецца гладкаствольная зброя. Аказалася, што гэта каштуе ад 1 млн 200 тысяч да 7 мільёнаў рублёў. А Дэпартамент аховы, між іншым, гасразліковая арганізацыя. І абсталяванне для сігналізацыі прадае таксама яна. І крадуць гладкаствольную зброю не часта. І выкарыстоўваецца яна для калектыўнага, загоннага палявання, альбо, як кажуць самі паляўнічыя, хобі. Гэта самы распаўсюджаны від грамадзянскай зброі. Дык навошта сігналізацыя?

Сам Алег Іванавіч — не паляўнічы, але падчас падрыхтоўкі законапраекта шмат размаўляў са знаўцамі і цяпер добра ведае многія нюансы.

— Здзівіла мяне сітуацыя са згубай грамадзянскай зброі, — кажа ён. — Аказалася, што ўладальнік у гэтым выпадку выплачвае толькі невялікі штраф, а потым ідзе і купляе новую. Пры тым, што атрымаць дазвол на набыццё і захоўванне зброі ў нас вельмі складана. Згодна з дзеючым законам, такога дазволу могуць пазбавіць, калі чалавек некалькі разоў здзейсніў адміністрацыйнае правапарушэнне — напрыклад, перайшоў вуліцу ў недазволеным месцы або перавысіў хуткасць пры кіраванні аўтамабілем.

Яшчэ больш абсурднымі выглядаюць пратаколы, складзеныя па факце згубы зброі: «Пайшоў у грыбы і... згубіў стрэльбу».

— Навошта ў грыбы ісці са стрэльбай? — абураецца былы ваенкам. — Вось вы смеяцеся, а між тым летась у Беларусі было згублена 67 ствалоў! Такой колькасцю агнястрэльных адзінак можна ўзброіць два ўзводы. А калі сабраць згубленую зброю за 10 гадоў — амаль полк. І ніхто не ведае, дзе гэты полк!

Згодна з новым законапраектам, пры згубе грамадзянскай зброі на тры гады анулюецца і права на яе набыццё і захоўванне. Алег Кот лічыць, што можна было б і назаўсёды ануляваць, але хаця б так. Зброя — рэч сур'ёзная, яе давяраюць толькі псіхічна здаровым і сумленным грамадзянам. Таму і берагчы яе трэба як зрэнку вока, каб яна не трапіла ў выпадковыя рукі і не была накіравана супраць чалавека. Калі зброю нехта губляе ў войску, яго прыцягваюць да крымінальнай адказнасці, нагадвае дэпутат.

## ІНВЕСТПРАЕКТ

Наступным наведвальнікам аказаўся кіраўнік прыватнага прадпрыемства Алег Кажухар. Ён прыйшоў з эскізным праектам будучага аптова-рознічнага гандлёвага комплексу па захоўванні і продажы плодаагароднiны. Аказалася, што ідэя належыць дэпутату.

— Гандаль плодаагароднiннай прадукцыяй на аптовым рынку Ждановічы ў нас вядзецца нецывілізавана, — тлумачыць Алег Іванавіч. — Па-першае, там бруд, парушэнне санітарных нормаў. Па-другое, выручка не фіксуецца, а значыць, і падаткі не выплачваюцца. Па-трэцяе, грошы вывозяцца з краіны, бо гандлююць там, як правіла, грамадзяне іншых дзяржаў. Упэўнены, што гэтакі гандаль падтрымлівае і ценявы валютны рынак.

Алег Кажухар займаецца плодаагароднiннай прадукцыяй восем гадоў. Неяк ён прыйшоў на прыём да дэпутата з пытаннем, якое тычылася мытнай палітыкі. Калі Алег Кот зразумеў, што гэтае пытанне закранае інтарэсы не толькі прадпрымальніка, але і спажыўцоў, ён скарыстаўся сваімі паўнамоцтвамі, каб дапамагчы яго вырашыць. Са свайго боку, прапанаваў Кажухару пабудаваць у Дзяржынску комплекс для захоўвання, фасоўкі і продажу плодаагароднiны.

Самае каштоўнае ў задуманым комплексе — наяўнасць сучасных сховішчаў-халадзільнікаў, пра будаўніцтва якіх ужо вядуцца перамовы з турэцкімі інвестарамі. Гэта дазволіла б захаваць якасць фруктаў і гароднiны, павысіць узровень сэрвісу і вывесці бізнэс з ценю.

Мяркуецца, што комплекс палепшыць і ўмовы рэалізацыі прадукцыі айчынных сельгаспрадпрыемстваў. Апроч захоўвання і продажу комплекс можа таксама заказваць такую прадукцыю, фінансаваць яе вытворчасць.

> **Трэба нашмат больш пакідаць заробленых грошай у рэгіёнах. Калі людзі зарабляюць дастаткова для самафінансавання сваёй мясцовасці, то спачатку павінны быць вырашаны праблемы гэтых людзей.**

— Я займаюся фруктовым бізнэсам з 2004 года, — падтрымаў размову Алег Кажухар. — За гэты час добра асэнсаваў, што далей так працаваць нельга. Беларусы не горшыя за іншых, яны заслугоўваюць таго, каб спажываць фрукты і гародніну сусветных стандартаў якасці. Што тычыцца гандлю на аптовым рынку Ждановічы, то такога непарадку няма больш ні ў адным беларускім горадзе. Размова не толькі пра парушэнне санітарных нормаў і ўхіленне ад выплаты падаткаў. Справа ў тым, што той, хто ўхіляецца ад падаткаў, парушае і ўмовы добрасумленнай канкурэнцыі. Таму мне спадабалася ідэя Алега Ката, хоць быць першапраходцам вельмі няпроста.

Пра тое, што ідэя добрая, сведчаць падлікі бізнэсмена: у халадзільніку садавіна і гародніна можа захоўвацца ў добрай якасці каля 30 дзён, а без халадзільніка — толькі сем. Пры гандлі з фуры праз 7 дзён губляецца 15% ад аб'ёму тавару, праз 14 дзён — 30%, праз 30 дзён — больш за 80%. Рэнтабельнасць ад продажу прадукцыі пры яе захоўванні ў халадзільных устаноўках на працягу першых 7 дзён — 23 %, пры гандлі з фуры — 3,9.

## БЛІНЧЫКІ

Цікава, што Алег Кот не адпусціў адразу свайго цёзку-бізнэсоўца, хоць той і папярэдзіў, што збіраецца ў гэты дзень яшчэ выехаць на машыне ў Кіеў. Дэпутат тут жа патэлефанаваў, папярэдзіў пра сустрэчу, і мы ўтраіх адправіліся на прадстаўнічай «Аўдзі» прадпрымальніка ў былы вайсковы пасёлак — да шматдзетнай маці. Па дарозе заехалі ў краму, дзе мае спадарожнікі купілі торт і вялікую каробку цукерак.

Жанна Шаланкевіч прыйшла на прыём да дэпутата восенню мінулага года. Яна засталася адна з пяццю дочкамі на руках, чацвёра з якіх — дашкольнага ўзросту. Але самая вялікая складанасць была ў тым, што печ у вясковым бараку, дзе яна з дзяўчынкамі жыла, моцна дыміла, і жанчына баялася за жыццё сваё і дзяцей.

Разам з камунальнымі службамі Алег Кот прыехаў паглядзець на тую печ, здзівіўся лядашчасці памяшкання, у якім жыло сімпатычнае сямейства, і адначасова — чысціні і парадку ў ім. Эксперты прыйшлі да высновы, што рамантаваць печ немэтазгодна, і дэпутат хадайнічаў перад мясцовымі ўладамі аб пошуку для жанчыны і яе дзяцей часовага жылля (да восені 2012 года яна плануе засяліцца ў новую кватэру ў Дзяржынску, якую будуе па льготным крэдыце). Кватэра з усімі выгодамі знайшлася, прычым такая, што старэйшай дзяўчынцы не прыйшлося мяняць школу. Алег Кот ужо быў тут, прывозіў навагоднія падарункі дзецям і бачыў, як уладкавалася яго падапечная. А цяпер ён, магчыма, наўмысна прывёз сюды бізнэсмена — каб чалавек ведаў, каму яшчэ можа спатрэбіцца яго дапамога. Алег Кажухар, дарэчы, вядомы ў раёне сваёй дабрачыннасцю.

Гаспадыня сустрэла нас чаем і смачнымі блінчыкамі з тварагом. Расказала пра дзяцей: старэйшая перамагла ў алімпіядзе, за малодшых маці хвалюецца ў сувязі з тым, што летам у пасёлак не будзе заязджаць школьны аўтобус. Справа не толькі ў тым, што яны не патрапяць у садок, але раптам спатрэбіцца ў паліклініку...

— Вырашым, — паабяцаў Алег Кот. — Не хвалюйцеся.

## ПАРКІНГІ І ПТВ

Расказаў Алег Іванавіч і пра яшчэ адну сваю інвестыцыйную задуму, звязаную з пабудовай паркінгаў.

— Для пабудовы аднаго гаража патрэбна 30 кв. метраў зямлі, для 100 чалавек — 3 га. На такой самай плошчы можна пабудаваць паркінг для 500 аўтамашын. Я абмяркоўваў гэтае пытанне з адным з нашых бізнэсменаў, ён прывёз каталогі з Германіі. Кажу: «Добра, але нам не трэба, каб немцы цалкам пабудавалі нам паркінгі са сваіх матэрыялаў. Няхай будуць іхнія апорныя канструкцыі, але металаканструкцыі, лесвіцы мы можам і самі зрабіць. Нам важна загрузіць свае прадпрыемствы». Нямецкія партнёры пагадзіліся.

Алег Кот лічыць: калі б у кожным мікрараёне побач з жылымі дамамі будавалі паркінг, праблема дваровых тэрыторый была б вырашана — машыны не займалі б дзіцячыя пляцоўкі і газоны .

— Алег Іванавіч, дэпутацкі тэрмін заканчваецца, а вашы вочы гараць, нібы вы толькі пачалі! — не вытрымала я.

— Прафесіяналам робішся ў новай для цябе сферы праз пэўны час, — адказаў Алег Іванавіч. — Самая вялікая аддача ад дэпутата — на трэці і чацвёрты год яго працы. Пасля працы над 8 законапраектамі мне ўжо прасцей узначальваць працоўную групу. Цяпер я ведаю, што для вырашэння нейкага пытання патрэбна сустрэча і вочная гутарка. Апеляваць неабходна канкрэтнымі фактамі.

Ён адразу прывёў прыклад з недасканалай работай пашпартных і рэгістрацыйных службаў у раёне, потым згадаў пра работу ўчастковых, якой ён зацікавіўся пасля звароту да яго жанчыны, чыю ўнучку збівае айчым...

Размова плаўна перацякла на тэму пра харчаванне вучняў у дзяржынскім ліцэі. «Мне ніхто не можа патлумачыць, чаму вучні ліцэяў у нашай краіне не ў роўных умовах? Чаму навучэнцы Уздзенскага сельскагаспадарчага прафесійнага ліцэя тры разы ядуць, а навучэнцы дзяржынскага ліцэя, якія гэтак жа сама прыехалі з розных вёсак, — адзін?» — задае рытарычнае пытанне дэпутат і сам жа на яго адказвае.

> **Беларусы не горшыя за іншых, яны заслугоўваюць таго, каб спажываць фрукты і гародніну сусветных стандартаў якасці.**

«Ёсць пастанова Савета Міністраў № 89, дзе прапісана, што трохразовым харчаваннем забяспечваюцца іншагароднія студэнты, якія навучаюцца ў ПТВ і каледжах, размешчаных у сельскай мясцовасці. Навучэнцы вучылішчаў, якія знаходзяцца ў межах горада, атрымліваюць толькі абед. Гэта значыць, будучыя нашы механізатары, будаўнікі і швачкі, якія нярэдка выраслі ў няпоўных вясковых сем'ях і маці якіх не так шмат зарабляюць, элементарна недаядаюць. Я ведаю, што гэта такое, як былы ваенкам».

На заканчэнне нашай сустрэчы Алег Кот дзеліцца тым, што ў яго не атрымалася. Яму так і не ўдалося дабіцца паляпшэння якасці дарог у Дзяржынскім раёне. Ён бачыць прычыну невырашальнасці гэтай праблемы ў размеркаванні грошай паміж датацыйнымі і недатацыйнымі раёнамі.

«Сёння недатацыйны раён зарабляе грошы на сябе і на бюджэт вобласці. Вобласць выдаткоўвае грошы са свайго бюджэту на тыя раёны, якія не могуць самі на сябе зарабіць. Але ў недатацыйных раёнах, як правіла, працуе больш прадпрыемстваў, жыве больш людзей, а значыць, там і праблем больш. Недатацыйны раён аказваецца ў горшым стане, чым датацыйны. Формула «Хочаш жыць лепш, лепш працуй!» губляе сэнс, бо калі мы больш заробім, мы больш аддадзім. Трэба нашмат больш пакідаць заробленых грошай у рэгіёнах. Калі людзі зарабляюць дастаткова для самафінансавання сваёй мясцовасці, то спачатку павінны быць вырашаны праблемы гэтых людзей. А ў вобласць трэба аддаваць тое, што засталося. Датацыйныя раёны павінны мець кірункі для развіцця, а не быць баластам. На жаль, там часта сустракаецца такая пазіцыя: «Няма ў нас грошай, ну і добра».

— З заканадаўчай ініцыятывай не спрабавалі выступіць?

— Пры абмеркаванні Падатковага кодэкса неаднаразова ставіў гэта пытанне перад урадам. Але пакуль у Міністэрства фінансаў іншыя прыярытэты — як мага больш напоўніць рэспубліканскі бюджэт. З гэтым не паспрачаешся, але нельга забываць пра тых, хто той бюджэт напаўняе. Тыя, хто зарабляе грошы для краіны, павінны жыць камфортна, яны павінны бачыць аддачу. Жыхары Дзяржынска зарабілі на тое, каб ісці на працу не ў ботах, а ў туфліках.

Мы развітваемся. У Алега Ката яшчэ заставалася палова працоўнага дня. Ён хацеў, каб я засталася, хацеў пазнаёміць мяне яшчэ з нейкімі людзьмі, ідэямі і праблемамі, але я дакладна адчула, што газетны артыкул не зможа ўмясціць столькі інфармацыі...

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ЖЭСам прыйдзецца пацясніцца

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На думку Анатоля Шагуна, гэта дасць магчымасць сур'ёзным кампаніям, уваходзячы на гэты рынак, планаваць свае выдаткі, бачыць перспектывы ўмоў той ці іншай працы. Яшчэ адной з прэферэнцый пры правядзенні конкурсу будзе прыцягненне ўласных грашовых сродкаў, інвестыцый у развіццё жыллёвага фонду або сумесна з грамадзянамі, якія пражываюць у гэтым жыллі.

Адзначым, што летась у 16 гарадах Беларусі ў якасці эксперымента аб'яўляліся такія конкурсы, але жаданага выніку пакуль не атрымана.

## АБСЛУГОЎВАННЕ ЖЫЛФОНДУ ПРЫВАТНЫМІ КАМПАНІЯМІ НЕ ПАЎПЛЫВАЕ НА КОШТ КАМУНАЛЬНЫХ ПАСЛУГ

У Беларусі рэгуляваннем тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі займаецца дзяржава. Сёння гэтае рэгуляванне ажыццяўляецца ў выглядзе пастаноў урада, якія вызначаюць, колькі каштуе тая ці іншая паслуга. У перспектыве, магчыма, прымаць падобнае рашэнне будуць мясцовыя органы ўлады, магчыма, будзе дыферэнцыяцыя па рэгіёнах, хоць гэта не блізкая перспектыва, лічыць намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Анатоль Шагун.

Паколькі камунальныя паслугі аказваюць кампаніі-манапалісты (у нас няма магчымасці выбраць арганізацыю, якая будзе аказваць такія паслугі, як цепла- і водазабеспячэнне, падача газу і электрычнасці), то дзяржаўнае рэгуляванне тарыфаў на гэтыя паслугі будзе заўсёды. Таму Анатоль Шагун заклікае не хвалявацца, што з прыходам прыватных кампаній некантраляваным чынам вырастуць цэны і тарыфы. Рост тарыфаў і прыход прыватнікаў у гэтым выпадку ніяк не будуць звязаны, падкрэсліў намеснік міністра.

> **Жыллёва-камунальныя паслугі аказваюцца нам дзвюма сістэмамі: сістэмай Міністэрства энергетыкі (газ, цяпло, электраэнергія — іх доля ў аплаце паслуг складае больш за 50%) і сістэмай Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі (водазабеспячэнне, каналізацыя, тэхнічнае абслугоўванне жыллёвага фонду і цеплавая энергія, што выпрацоўваецца камунальнымі кацельнымі).**

> **Згодна з праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, да 2015 года ў Беларусі плануецца давесці ўзровень кампенсацыі насельніцтвам затрат на аказанне жыллёва-камунальных паслуг да 60%.**

Сёння, па словах Анатоля Шагуна, у бюджэце сярэднестатыстычнай сям'і ўзровень аплаты за жыллёва-камунальныя паслугі не перавышае 5-8% ад усіх выдаткаў. Палітыка дзяржавы будзе накіравана на паэтапнае павелічэнне тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі, зыходзячы з рэальных даходаў насельніцтва, а таксама ўдасканаленне механізмаў адраснай сацыяльнай дапамогі тым, хто мае патрэбу ў ёй, у тым ліку для аплаты паслуг ЖКГ. Што тычыцца гэтага года, рэзкага росту аплаты за кватэру не чакаецца, абяцае Анатоль Шагун.

## ДЫФЕРЭНЦАВАНАЯ ПЛАТА ЗА ВАДУ — ЧАСОВАЯ МЕРА

Як заявіў Анатоль Шагун, увядзенне дыферэнцаванай платы за паслугі водазабеспячэння і водаадвядзення дазволіла краіне эканоміць грашовыя сродкі, а арганізацыям ЖКГ атрымліваць пэўны аб'ём дадатковай выручкі. Таксама, як лічыць намеснік міністра ЖКГ, гэтая мера зможа падрыхтаваць людзей да будучага павышэння тарыфаў.

На яго думку, дыферэнцаваная плата будзе да таго часу, пакуль тарыф на аказанне жыллёва-камунальных паслуг для насельніцтва не зраўнуецца з эканамічна абгрунтаванымі выдаткамі. Пасля гэтага неабходнасць у дыферэнцыяцыі адпадзе, і тарыф зраўнуецца.

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

## «ЗЯЛЁНЫЯ» ФАЛЬШЫЎКІ НА РУБЛІ. РУБЛІ — НА СПІРТНОЕ

**Супрацоўнікі падраздзялення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ГУУС Мінгарвыканкама і Цэнтральнага РУУС сталіцы затрымалі семярых жыхароў Мінска і Мінскай вобласці, якія распаўсюджвалі на тэрыторыі горада і вобласці падробленыя купюры наміналам 100 долараў ЗША.**

— Падчас работы па справе высветлілася, што фальшывыя банкноты мэтанакіравана прывёз у краіну з замежжа яшчэ некалькі гадоў таму 66-гадовы жыхар адной з вёсак Пухавіцкага раёна, — паведамілі ў прэс-службе ГУУС Мінгарвыканкама. — Аднак адразу збываць іх грамадзянін не стаў. Падробленыя грошы праляжалі да сёлетняга мая, калі разам са сваімі аднавяскоўцамі і іх прыяцелямі пенсіянер не пачаў абменьваць фальшывую валюту на беларускія рублі. Апошнія тут жа разыходзіліся на спіртное. Усяго сямёра чалавек паспелі рэалізаваць агулам 700 долараў. Аператыўнікі канфіскавалі яшчэ 11 банкнот па 100 долараў. Усе ўдзельнікі злачыннай суполкі затрыманыя і знаходзяцца ў ізалятары часовага ўтрымання. Супраць іх заведзена крымінальная справа. Таксама праводзяцца мерапрыемствы па выключэнні з абарачэння тых фальшывых грашовых знакаў, якія зламыснікі паспелі рэалізаваць.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



# «СЛУЖУ БЕЛАРУСІ І СПЕЦНАЗУ!»

**Чарговыя выпрабаванні на права насіць крапавы берэт прайшлі ва ўнутраных войсках МУС Беларусі.**

Для кожнага з 79 чалавек, якія вырашылі сёлета ўступіць у эліту «крапавага братэрства», выпрабаванні — своеасаблівы экзамен, вытрымаўшы які, ён атрымлівае галоўную ўзнагароду — сімвал мужнасці, гонару і годнасці.

Для многіх «крапавы берэт» — гэта мара з дзяцінства, некаторых «крапавае братэрства» пачынае вабіць падчас службы, а асобныя людзі ідуць да гэтай мары практычна ўсё сваё жыццё. Байцы, якім не ўдалося атрымаць «крапавы» з першага разу, уступаюць у барацьбу зноў і зноў. Вядомыя выпадкі, калі ўладальнікамі запаветнага берэта станавіліся ў 37 і нават у 42 гады. Але тым даражэйшая і больш жаданая перамога. Байцы, якія ўжо прайшлі гэтыя іспыты, у адзін голас сцвярджаюць: самае складанае — гэта выстаяць маральна. Але і фізічна вельмі цяжка — 12-кіламетровы марш-бросак у поўнай амуніцыі, вогненна-штурмавая паласа, практыкаванні стрэльбаў з трох відаў зброі і фінальны рукапашны бой. Ніхто і не казаў, што будзе лёгка, менавіта таму з дзясяткаў даходзяць адзінкі. Калі аб'яднаць у адно сілы, дух і жаданне, то ўсё магчыма! І запаветныя словы напрыканцы — «Служу Беларусі і спецназу!»

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**

*Вучэбны цэнтр унутраных войскаў «Валоўшчына», Мінскі р-н.*





■ Інфарм-укол

# ХРАНІЧНЫ СТРЭС СПРЫЯЕ ІНФАРКТУ

**Напружанне, якое ўзнікае пад уплывам нейкага моцнага ўздзеяння, абарончая рэакцыя арганізма ў адказ на неспрыяльныя змяненні навакольнага асяроддзя ёсць стрэс. Мудрая прырода надзяліла нас мноствам механізмаў, якія дапамагаюць выжыць. Яны тэрмінова прыводзяцца ў дзеянне, калі ўзнікае канфліктная сітуацыя, якая патрабуе хуткай рэакцыі. Гэта адбываецца міжвольна, падсвядома, і мы не ў стане гэта кантраляваць.**

Па камандзе мозга ў кроў выкідваецца адрэналін, які прымушае сэрца біцца хутчэй, а артэрыяльны ціск і ўзровень цукру ў крыві павышаюцца. Прыток крыві да мозга і канечнасцяў павялічваецца, а да органаў стрававання і скуры змяншаецца. Дыханне пачашчаецца, становіцца паверхоўным. Рэзервы тлушчу і цукру пачынаюць актыўна траціцца. Усе гэтыя змяненні надыходзяць для таго, каб забяспечыць мышцы кіслародам і спажыўнымі рэчывамі, развіць максімальнае мышачнае намаганне — мацней ударыць або хутчэй збегчы.

— Сувязь стрэсу з сардэчна-сасудзістымі захворваннямі вядома кардыёлагам ужо даўно, — кажа **загадчыца раённага кардыялагічнага цэнтра Першамайскага раёна г. Мінска Наталля ДАРАШЭВІЧ.** — Адразу пасля няшчасцяў і трагедый, якія становяцца ўзрушэннем для ўсяго грамадства, узнімаюць галаву гіпертанія, інфаркт міякарда, парушэнні сардэчнага рытму. У XXI стагоддзі, якое нездарма называюць стагоддзем неўрозаў, кардыёлагаў насцярожыў той факт, што стрэс і дэпрэсія выйшлі на трэцяе месца ў спісе фактараў рызыкі інфаркту міякарда, пацясніўшы цукровы дыябет, гіпертэнзію і атлусценне. Працяглы і хранічны стрэс падточвае сілы арганізма, выклікае розныя хваробы...

Калі арганізм працяглы час падвяргаецца стрэсу, ён пачынае падаваць фізічныя, разумовыя, эмацыйныя і паводзінавыя сігналы, якія ўказваюць на тое, што далейшае ўздзеянне стрэсу на арганізм можа прывесці да праблем. Акрамя таго, стрэс можа ўзмацніць і працяканне хранічных захворванняў. Запомніце гэтыя сігналы.

***Фізічныя***: галавакружэнне, боль, скрыгатанне зубамі, сціскванне сківіцы, галаўны боль, парушэнне стрававання, напружанне мышцаў, пагаршэнне сну, пачашчэнне сэрцабіцця, шум у вушах, сутулая постаць, патлівасць далоняў, стомленасць, знямогласць, дрыжанне, прыбаўка або страта вагі.

***Псіхічныя***: пастаянны неспакой, страх, цяжкасць у прыняцці рашэнняў, забыўлівасць, цяжкасці з канцэнтрацыяй, недахоп творчай энергіі, страта пачуцця гумару, дрэнная памяць.

***Эмацыйныя***: злосць, неспакой, дэпрэсія, плаксівасць, адчуванне бяссілля, частыя змены настрою, раздражняльнасць, адчуванне адзіноты, негатыўнае мысленне, нервовасць, туга.

***Паводзінавыя***: пераяданне, крытычнае стаўленне да навакольных, прыступы ярасці, частая змена работы, злоўжыванне алкаголем, ужыванне наркотыкаў.

## Як перамагчы стрэс?

**Не злоўжывайце ежай і алкаголем.** Яны не могуць ні заспакоіць, ні зняць стрэс. Фактычна нават наадварот.

**Не курыце.** Акрамя таго, што курэнне само па сабе з'яўляецца фактарам рызыкі артэрыяльнай гіпертэнзіі, нікацін, які паступае ў кроў, сам выклікае сімптомы стрэсу.

**Рэгулярна рабіце фізічныя практыкаванні.** Даказана, што заняткі аэробікай спрыяюць выкідванню ў кроў эндарфінаў — натуральных рэчываў, эфект якіх звязаны з абязбольваннем і паляпшэннем настрою.

**Штодня спрабуйце расслабіцца на некаторы час.**

**Бярыце суразмерную адказнасць.** Не бярыцеся за справы, з якімі не справіцеся.

**Вучыцеся эфектыўна выкарыстоўваць час.** Можаце нават пазнаёміцца з такой навукай, як тайм-менеджмент.

**Стаўце рэалістычныя мэты ў жыцці.**

**Дастаткова адпачывайце.**

## Як пазітыўна разважаць?

1. Захоўвайце спакой. Дыхайце глыбей.
2. Заўсёды гаварыце самому сабе, што зможаце вырашыць гэтую праблему.
3. Будзьце рэалістычнымі, аб'ектыўнымі, гібкімі.
4. Імкніцеся думаць аб тым, што можна «выцягнуць» з той ці іншай праблемы. Думайце аб магчымых рашэннях і выбірайце найбольш прымальнае.
5. Думайце пра наступствы. Пытайцеся ў сябе: што можа здарыцца самае горшае?
6. Спытайце ў сябе, чаму можа навучыць вас гэта сітуацыя.

## Як зменшыць фактары стрэсу?

— Пазбягайце дробных раздражняльнікаў.

— Калі ў вашым жыцці адбываюцца змяненні, імкніцеся не мяняцца рэзка. Рабіце нейкі час звыклыя рэчы, якія вам падабалася рабіць.

— Правільна размяркоўвайце свой час. Не хапайцеся за некалькі спраў адразу.

— Калі адчуваеце «накат» стрэсу, зрабіце перапынак, расслабцеся.

## Як навучыцца расслабляцца?

**Глыбокае дыханне.** Уявіце, што ў вашым жываце ёсць паветраны шар. Удыхніце, нібыта напаўняеце гэты шар, і выдыхніце, нібыта спустошваеце яго. З кожным павольным удыхам вы будзеце больш і больш расслабляцца.

**Расслабленне мышцаў.** Некалькі разоў зрабіце глыбокі ўдых, павольна выдыхайце. У думках «прайдзіцеся» па сваім целе. Расслабце мышцы, павольна пакруціце галавой спачатку ў адзін, а потым у другі бок, паварочвайце плячамі назад-наперад. Дыхайце глыбока.

**Псіхалагічнае расслабленне.** Уявіце сябе ў лесе, каля спакойнага мора або ў гарах.

**Музыка для расслаблення.** Слухайце час ад часу спакойную інструментальную музыку.

## Што рабіць, калі дрэнна спіцца?

- Кладзіцеся спаць у адзін і той жа час.
- Зрабіце камфортным месца для сну — ад ложку да падушкі.
- У спальні павінна быць спакойна, ціха і цёмна.
- Не глядзіце ў спальні тэлевізар і не працуйце за камп'ютарам.
- Не спіце днём падоўгу.
- Калі адчуваеце неспакой, пагаварыце з блізкім, сваяком або сябрам, якому давяраеце.
- Ніколі не прымайце снатворныя, не прызначаныя ўрачом.
- Не ўжывайце перад сном каву або чай.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■ З нагоды

# Два ордэны для матулі

**Праз празрыстую столю гарадской ратушы ў Мінску мужчына з дзіцем на руках махаў сваёй жонцы. Там, унізе, акрамя яго жонкі, яшчэ некалькі жанчын з прыкметным хваляваннем чакалі сваіх узнагарод. На гэтым тыдні, у Міжнародны дзень сям'і, 25 мінчанак атрымалі ордэн Маці. Гэтым ганаровым ордэнам узнагароджваюць жанчын, якія нарадзілі і выхавалі пяць і больш дзяцей. Узнагароды ўручыў шматдзетным матулям першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Ігар Васільеў.**

— Сям'я — гэта самае дарагое, што ёсць у жыцці чалавека, — сказаў ён, калі віншаваў жанчын. — Няма больш прыгожага слова чым «мама». Маці ўвасабляе сабой дабрыню і пяшчоту, мужнасць і трываласць. Яна аб'яднала ў сабе самыя лепшыя якасці жанчыны.

Таксама прадстаўнік улады адзначыў, што дзяржава шмат робіць для падтрымкі вялікай сям'і, і гэты кірунак з'яўляецца адным з прыярытэтных у палітыцы нашай краіны.

Разам з ордэнам Маці мінчанкам уручылі кветкі, памятныя падарункі ад Мінгарвыканкама і аднаразовую выплату ў памеры пяціразовага бюджэту пражытковага мінімуму, а гэта сёння 3 543 400 рублёў.

Пасля заканчэння афіцыйнай часткі ўсе шматдзетныя матулі былі запрошаны ў іншую залу, дзе адзначылі свята келіхам шампанскага.



Шчаслівая ўладальніца двух ордэнаў з мужам Андрэем.

— Для мяне гэта ўжо другая ўзнагарода за сённяшні дзень, — прызналася шматдзетная маці Наталля Абдуліна. — Першую самаробную ўзнагароду я атрымала сёння раніцай ад сваёй дачкі, якой зараз два з паловай гады. Бачыце, з аднаго боку на ёй намалявана маці, з другога — тата. Так і павінна быць! Бо без майго каханага мужа не было б у нас такой вялікай і дружнай сям'і. Увогуле, у сваіх бацькоў я была адзінай дачкой... Таму яшчэ ў дзяцінстве вырашыла для сябе, што ў мяне будзе як мінімум, трое дзетак. Праўда, нараджаліся толькі хлопцы, а нам так хацелася дачку! Вось пятай і з'явілася Аліса. Гэтая маленькая дзяўчынка прынесла ў нашу сям'ю шмат радасці. Я ўпэўнена, што самыя шчаслівыя жанчыны — гэта шматдзетныя матулі.

Усяго ў Беларусі ордэнам Маці ўзнагароджаны 6918 жанчын.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ**

■ Ведай нашых!

# ФЕНОМЕН САЛЯРЦІНСКАГА

**Славуты сын віцебскай зямлі, на жаль, мала вядомы ў роднай Беларусі. Сучаснікі пісалі пра прафесара кансерваторыі Салярцінскага, што ён меў фенаменальную памяць. Мог узяць любую кнігу, бегла яе перагартаць і вярнуць са словамі: «Праверце». Якую б старонку яму ні называлі, ён тут жа прачытваў яе на памяць. А калі часам і памыляўся, то ў дробязях. На памяць ведаў сімфоніі. А яшчэ валодаў 26 замежнымі мовамі і 100 дыялектамі!**



**Помнік Салярцінскаму ў горадзе Віцебску.**

### СЫН ПРА БАЦЬКУ

Салярцінскі — музыказнаўца, музычны і тэатральны крытык, спецыяліст у пытаннях эстэтыкі і псіхалогіі, вядомы на ўвесь свет. Івана Іванавіча Салярцінскага, 110-я гадавіна з дня нараджэння якога будзе святкавацца сёлета, смела можна параўнаць са знакамітымі мастаком Шагалам, філосафам Бахціным, кампазітарам Шастаковічам і іншымі «зорнымі» людзьмі.

У Віцебску, дзе ў снежні 1902 года нарадзіўся Салярцінскі, недалёка ад цяперашняга будынка музея Шагала стаіць помнік, побач — музычнае вучылішча, якое носіць яго імя. І на фестываль імя Салярцінскага, які праводзіцца вось ужо больш за дваццаць гадоў, з задавальненнем прыязджаюць «зоркі» класічнай і фальклорнай музыкі першай велічыні.



Бацька Салярцінскага быў старшынёй акруговага суда, потым тайным саветнікам, з 1906 года — сенатарам. Вось што пра гэта і пра гісторыю роду Салярцінскіх расказвае сын Івана Іванавіча — Дзмітрый Іванавіч. Ён жыве ў Санкт-Пецярбургу, але штогод стараецца прыехаць у Віцебск, каб узяць удзел у чытаннях, прысвечаных жыццю і творчасці бацькі, якія праходзяць падчас правядзення фестывалю імя Салярцінскага. Дзмітрый Салярцінскі таксама мае непасрэднае дачыненне да «свету музыкі» — дзясяткі гадоў быў дырэктарам Вялікай канцэртнай філарманічнай залы ў паўночнай сталіцы Расіі.

— Наша прозвішча прыдумалі ў праваслаўных семінарыях. Бо з канца 17 стагоддзя семінарыстам давалі новыя прозвішчы ўзамен іх «простых». Слова «салертус» у перакладзе з латыні значыць «майстэрскі», «умелы». Наш продак Сяргей Аляксандравіч Салярцінскі быў прафесарам духоўнай акадэміі ў Пецярбургу, — расказвае ён. — Дзед мой, стацкі саветнік, у снежні 1898 атрымаў прызначэнне на пасаду старшыні акруговага суда ў Віцебску, куды ён пераехаў з Петразаводска. У Віцебску ажаніўся з беспасажніцай, юнай Кацярынай. І ў 1902 годзе ў іх нараджаецца першынец — Іван. На вуліцы Гогаля ў Віцебску стаяў дом, дзе нарадзіўся бацька. Ужо праз некалькі месяцаў пасля нараджэння майго бацькі дзеда адправілі служыць у Харкаў, дзе ў 1907 годзе ён памёр. Засталася яго ўдава з трыма малымі дзецьмі. Жылі яны вельмі сціпла. Пры гэтым Кацярына Іосіфаўна сама вучыла дзяцей французскай мове... У 1920-х Іван Іванавіч Салярцінскі пазнаёміўся і пасябраваў з лепшымі прадстаўнікамі інтэлігенцыі. Тады ў Віцебску з поспехам праходзілі канцэрты сімфанічнага аркестра пад кіраўніцтвам знакамітага Мікалая Малько, у якога потым ён і вучыўся. На канцэрт звычайна збіралася гарадская інтэлігенцыя. Гэтыя імёны сёння ведае ўвесь свет: Марк Шагал, Казімір Малевіч, філосаф і паэт Леў Пумпянскі, Міхаіл Бахцін. Частым слухачом быў і Іван Салярцінскі, на той час сямнаццацігадовы хлопец. Менавіта ў Віцебску, дзе ён жыў да 18 гадоў, у Івана Салярцінскага зарадзілася любоў да сімфанічнай музыкі.

### ЯГО ЎНІВЕРСІТЭТЫ

У 1921—1924 гадах Іван Салярцінскі вучыўся ў Петраградскім універсітэце, дзе вывучаў рамана-германскую філалогію і іспанскую класічную літаратуру. Паралельна штудзіраваў гісторыю тэатра ў Інстытуце гісторыі мастацтваў, які скончыў у 1923-м. Потым у гэтай жа ВНУ скончыў аспірантуру. Цікава, што ў названым інстытуце, ужо выкладаючы на славесным аддзяленні курсы логікі і псіхалогіі, іншае аддзяленне наведваў як студэнт.

У сярэдзіне 1920 гадоў браў прыватныя ўрокі дырыжыравання. З 1923-га выкладаў гісторыю музыкі, літаратуры, тэатра, псіхалогію, эстэтыку і шэраг іншых дысцыплін у розных ВНУ Ленінграда. У тым ліку ў кансерваторыі, дзе ў 1939-м стаў прафесарам. У 1934—1941 ён працаваў таксама ў выдавецтве пры філармоніі. Пасля стаў яе мастацкім кіраўніком, сумяшчаючы гэтую дзейнасць з працай у Кіраўскім тэатры.

Падчас вайны разам з калектывам Ленінградскай філармоніі Іван Іванавіч Салярцінскі быў эвакуіраваны ў Новасібірск, дзе і памёр у 1944 годзе. Другое фартэпіяннае трыа Шастаковіча, напісанае ў тым жа годзе, прысвечана памяці яго сябра Салярцінскага...

### «ЗОРКІ» ЗБІРАЮЦЦА Ў ВІЦЕБСКУ

З некаторымі «зоркамі» класічнай і народнай музыкі, якія бяруць удзел у віцебскім міжнародным фестывалі імя Салярцінскага, арганізатары вядуць перамовы не адзін год. І нават не з-за высокіх ганарараў, а таму, што гэтыя артысты пастаянна на гастролях за мяжой — выступаюць на лепшых канцэртных пляцоўках свету.

Фестываль летась прайшоў ужо ў 23 раз. Яго ганаровым куратарам па традыцыі стаў сын Івана Салярцінскага. Трэба думаць, што наступнае свята музыкі, прысвечанае юбілею майстра, парадуе шматлікімі сюрпрызамі.

Дарэчы, ва ўпраўленні культуры Віцебскага аблвыканкама падтрымалі ідэю карэспандэнта «Звязды» даць імя Салярцінскага, акрамя ўсяго іншага, і адной з вуліц горада.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ШАШКІ

Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА.

### ІГРОК, РАШАЛЬНІК, ПРАПАГАНДЫСТ



Інжынер Анатоль Антонавіч Пярхальскі ў глыбоцкім ААТ «АТП-16» адказваў за ахову працы. Роднае прадпрыемства падпісвае яго на «Звязду» — любімае перыядычнае выданне ветэрана. «Чытаючы газету, — піша ён у зборніку сваіх партый «Праз паражэнні — да перамогі» (Віцебск, 2010), — я заўсёды звяртаў увагу на рубрыку «Шашкі». І ўрэшце зрабіў выбар — трэба гуляць у іх. Такім чынам, распачаў прыналнае і змястоўнае жыццё ў вольны час». І ўжо ёсць добрыя паказчыкі: у завочных першынствах краіны быў мацнейшым у турніры кандыдатаў у майстры спорту, заваяваў сярэбраны медаль у класічнай версіі першай лігі, цяпер выступае ў вышэйшым дывізіёне, а ў конкурсе рэспубліканскага значэння «Пагода ў доме»-8 увайшоў у лік лепшых рашальнікаў. Раней выдаў зборнікі выпускаў шашак у газетах «Звязда» і «Веснік Глыбоччыны» ў афармленні мясцовага «ФОТА-цэнтра», якія шчодра прапанаваў выкарыстоўваць у якасці прызоў нашых конкурсаў. Наступныя эпізоды з партый моцнага ігрока, першакласнага рашальніка і прапагандыста старадаўняй гульні заслугоўваюць увагі: 1. **Белыя** (Д. Турчанка): b2, b4, c3, c5, e3, g1, h6 (7). **Чорныя** (А. Пярхальскі): a5, b8, d6, e5, f6, f8, h2 (7). Чорныя прадугледзелі 1...fg5! 2. c:e7 3. h:f4 4. ed4 gf2 5. g:e3 hg1 6. ba3 ba7



7. ef4 g:b6 8. fg5 bd8 9. gh6 df6x. 2. **Белыя** (А. Пярхальскі): a3, c3, e1, f2, h2, h6 (6). Чорныя (У. Бандарык): a5, c5, e5, e7, f8, h4 (6). Тут белыя вырашылі не рызыкаваць і правялі нічыйную камбінацыю. Пашукайце яе і вы.

### СВОЙ КОНКУРС

Ганаровы міжнародны гросмайстар Леанід Вітошкін (Гомель) працягвае яго чарговым заданнем:



№ 16/5. **Белыя**: 24, 30, 34, 35, 37, 39, 40 (7). **Чорныя**: 10, 13, 19, 27, 28, 38 (6). Выйгрыш.

* * *

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: ***220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».***

### ВЫНІКІ КОНКУРСУ

У конкурсе «Пагода ў доме»-8 бралі ўдзел: А. Белы (Наваполацк), У. Валчкоў (Маладзечна), А. Нікіфараў і А. Літвінаў (Мінск), В. Голас (Любань), С. Нячаеў (Баранавічы), А. Шурпін (Клімавічы), М. Трухан (в. М. Пагост Салігорскага раёна) і інш.

Самыя дапытлівыя аналітыкі заўважылі пабочныя развязкі ў заданнях №№ 1, 7 і 11, а ў № 22 даказалі нічыю: 1. gf4=. З улікам заробленых дадатковых ачкоў перамаглі Ігар Ананіч (Гродна), Уладзімір Сапяжынскі (Рагачоў), Віктар Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), Уладзімір Бандарык (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна), Аляксандра Камінская (Вілейка), Л. Вітошкін і А. Пярхальскі. Яны пацвердзілі сваё высокае званне першакласных рашальнікаў. Астанія ўдзельнікі набралі па 25 ачкоў, развязаўшы ўсе заданні (норма другога разраду, згодна з класіфікацыяй, зацверджанай Міністэрствам спорту і турызму).

Гэта публікацыя з'яўляецца падставай: выканкамам — для прысваення звяздоўскім канкурсантам адпаведных разрадаў, а Свіслацкаму прадпрыемству жыллёва-камунальнай гаспадаркі, на прызы якога праводзіліся спаборніцтвы, — для ўзнагароды лаўрэатаў конкурсу, яго суддзі Мікалая Грушэўскага і каардынатара Яўгена Ляхава.

■ Крымінал

## АЦАНІЛА МУЖА Ў $2 ТЫСЯЧЫ

**У следчым ізалятары зараз знаходзіцца 50-гадовая жыхарка Гомеля, арыштаваная па абвінавачванні ў прыгатаванні да наўмыснага забойства.**

За забойства 47-гадовага мужа жанчына рыхтавалася заплаціць $2 тыс., паведамілі ў прэс-службе ўпраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Гомельскай вобласці. Грамадзянка частку грошай аддала загадзя, аднак супрацоўнікі абласнога ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю МУС, якія атрымалі гэтую інфармацыю, не далі магчымасці давесці справу да канца. Па гэтым факце заведзена крымінальная справа.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**


Утерянный диплом № 0563653 УО «Минское государственное профессионально-техническое училище № 38 перерабатывающей промышленности», выданный Чуклаю А.В., считать недействительным.

Вниманию участников аукциона по продаже права аренды земельных участков, который состоится 5 июня 2012 г. (газета «Звязда» от 16.05.2012 г. № 91, 5-я полоса)! СНЯТ С АУКЦИОНА ЛОТ № 12: право аренды земельного участка в микрорайоне № 104 позиция № 53 с кадастровым номером 340100000007005908, площадью 0,1606 га для строительства банно-оздоровительного комплекса (тел.: 77 69 35, 77 67 27).

УНП 400251518

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «ГОМЕЛЬХИМТОРГ» (продавец)**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ <u>25 июня 2012 года</u> ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16**

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена продажи лота, с НДС, руб. РБ | Задаток, с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение (инв. № 350/С-94898), площадью 599,5 кв.м, Административно-хозяйственное здание**<br>**Капитальное строение (инв. № 350/С-78631), площадью 8,7 кв.м, Проходная**<br>**Транспортная подстанция ТП-115 (инв. № 003)**<br>**Весовая (инв. № 006) площадью 227,0 кв.м**<br>**Навес (инв. № 152) площадью 30,0 кв.м**<br>**Узел учета теплоэнергии (инв. № 011)**<br>**Сооружения:** (инв. № 030) – Ограждение ж/б 532,1 м, ограждение металлическое 27,9 кв.м; (инв. № 031) – ворота механические – 24,4 кв.м; (инв. № 1090а) – ворота металлические 4,4 кв.м; (инв. № 1076а) – Асфальтобетонное покрытие 3 071,0 кв.м. (инв. № 002) – прожекторная мачта – громоотвод (инв. № 007) – Туалет<br>**Передаточные устройства:** (инв. № 069) – теплотрасса 53,0 м; 7,5 м; (инв. № 068) – водопровод; (инв. № 067) – канализация фекальная (инв. № 066) – сети электроснабжения | 1 808 824 800 | 180 000 000 |

Продавец: ОАО «ГОМЕЛЬХИМТОРГ», Гомельская область, г. Гомель, ул. Могилевская, 20.

**Имущество расположено по адресу: ул. Троллейбусная, 10, г. Гомель. Шаг аукциона – 5 %.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

1. Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (ОАО «ГОМЕЛЬХИМТОРГ) р/с № 3012111970016 Региональная Дирекция № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, УНП 400048086, ОКПО 29013213 **по 21 июня 2012 года до 17.00.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме, подписать соглашение с приложением необходимых документов по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-16, г. Гомель от даты опубликования настоящего извещения **по 21 июня 2012 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, в т.ч. Положением ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 89 64, 74 17 34 и на сайте gomeloblreklama.by.**

Кірмаш. Аддзел рэкламы 287 17 79. Штотыднёвы рэкламны выпуск № 9 (720)

**ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ**

**ПРАДАЕЦЦА**

❐ Дача ў в. Чарняты Мядзельскага р-на, возера 100 м. Тэл. 8 021 5551233, МТС 7772309.

❐ Аднапакаёвая кватэра ў пас. Гарадзішча Мінскага р-на. Тэл. 8 029 2557358, 8 029 3038126, 8 029 3038305.

❐ Дача садаводства, 3 узроўні, выгоды, курортнае месца (возера Лосвіда). Тэл. 8 029 2900710.

❐ 3-пакаёвая кааператыўная кватэра з гаражом у райцэнтры Гарадок (65 м², 2-і паверх) танна, растэрміноўка, або абмяняю на любое жыллё ў Мінску, прыгарадзе. Варыянты. Тэл. 8 029 2900710.

❐ Дом пад знос, або як дачу, в. Чабусы, 12 км ад Любані. Тэл. 8 029 2760536.

❐ Касілка новая (Польшча) 2-ротарная. Тэл. 8 029 2920614.

❐ Катэдж (143 кв.м) у Аляхновічах з выгодамі, або мяняю на кватэру ў Мінску. Тэл. 8 033 3200900.

❐ Козлік (2 мес.), мяса трусоў. Тэл. 8 029 7660985.

❐ А/м «Форд Сіера» легкавы, 1992 г., ТО, СТ, аб'ём 2,3, белы, кошт дагаворны. Тэл. 8 029 2730414, 8 017 9344182.

**КУПЛЮ**

❐ Авечак па даступнай цане. Тэл. 8 017 4250505.

ЗВЯЗДА **КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**

**ЗАПОЎНІЦЕ РАЗБОРЛІВА, ВЫРАЖЦЕ І ВЫШЛІЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
**220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.**

**АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.**

Пашпарт, серыя______ №____________ Выдадзены ______________

Подпіс ______________ Дата ________

Трастбанк

## «Банк, основанный на доверии»
## ЗАО «Трастбанк»

220035, г. Минск, ул. Игнатенко, 11

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2012 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2011 год | 2010 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 7.1.1. | 41 419,3 | 15 406,7 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 7.1.2. | 1 923,6 | 636,9 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 7.1.3. | 372 259,7 | 33 722,2 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 7.1.4. | 57 177,1 | 59 909,0 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 7.1.5. | 35 054,5 | 3 045,2 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 7.1.6. | 372 425,1 | 257 032,1 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 2. | 2 287,5 | 2 189,9 |
| 10 | Инвестиции в зависимое юридическое лицо | | 2. | 6 462,7 | 1 689,4 |
| 11 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 7.1.7. | 82 659,4 | 44 955,1 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1111 | 7.1.8. | 28 759,4 | 18 085,5 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 7.1. | 1 000 428,3 | 436 672,0 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 7.1.9. | 45 792,9 | 15 065,8 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 7.1.10. | 90 628,9 | 21 780,1 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 7.1.11. | 600 030,0 | 265 850,6 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 7.1.12. | 104 896,8 | 27 118,4 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 7.1.13. | - | 1 950,1 |
| 21 | Прочие обязательства | 1206 | 7.1.14. | 11 538,4 | 10 051,7 |
| 22 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 852 887,0 | 341 816,7 |
| 23 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 24 | Уставный фонд | 1211 | 7.1.15. | 48 785,7 | 48 785,7 |
| 25 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 26 | Резервный фонд | 1213 | 7.1.16. | 9 719,8 | 4 880,1 |
| 27 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 7.1.17. | 70 882,4 | 32 176,1 |
| 28 | Накопленная прибыль | 1215 | 7.1.18. | 18 153,4 | 9 013,4 |
| 29 | Всего капитал, принадлежащий головной организации – банку | | | 147 541,3 | 94 855,3 |
| 30 | ВСЕГО капитал | 121 | | 147 541,3 | 94 855,3 |
| 31 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 7.1. | 1 000 428,3 | 436 672,0 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ о прибыли и убытках за 2011 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2011 год | 2010 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 7.2.1. | 58 461,0 | 36 320,3 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 7.2.1. | 49 826,0 | 29 193,5 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 7.2.1. | 8 635,0 | 7 126,8 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 7.2.2. | 42 207,0 | 40 005,2 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 7.2.2. | 3 642,3 | 2 029,6 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 7.2.2. | 38 564,7 | 37 975,6 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 7.2.3. | 91,4 | 139,5 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 7.2.4. | - | (19,1) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 7.2.5. | 8 745,0 | 1 524,4 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 7.2.6. | (473,3) | (1366,2) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 7.2.7. | 25 582,0 | 19 493,0 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 7.2.8. | 19 972,1 | 8 137,2 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 7.2.9. | 34 026,1 | 24 792,8 |
